**БДЭУ** сардэчна запрашае абітурыентаў на вучобу

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКАНАМІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА

# ЭКАНАМІСТ

ВЫХОДЗІЦЬ АДЗІН РАЗ У ДВА ТЫДНІ | № 6 (727) | Серада, 7 КРАСАВІКА 1999 года | Заснавана ў студзені 1977 года | Кошт па падпісцы 3000 рублёў

# Беларускі эканамічны

***Наш універсітэт — адна з буйнейшых і старэйшых ВНУ Рэспублікі Беларусь. Пачаўшы сваю дзейнасць 66 гадоў таму, універсітэт знаходзіцца ў няспынным развіцці і пошуку эфектыўных формаў і метадаў адукацыі. Пашыраецца падрыхтоўка спецыялістаў, актыўна фарміруецца яго выкладчыцкі і навуковы патэнцыял, паляпшаецца матэрыяльная база і ўмовы для навучання.***

***Сёння універсітэт — адзіная комплексная вышэйшая навучальная ўстанова Беларусі, якая вядзе падрыхтоўку спецыялістаў па эканоміцы і менеджменту, фінансавай і банкаўскай справе, уліку і статыстыцы, камерцыйнай дзейнасці, міжнародных эканамічных адносінах, маркетынгу, гаспадарчаму праву. Універсітэту прадастаўлены статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі па падрыхтоўцы эканамічных кадраў.***



*На дзесяці факультэтах універсітэта, па 29 спецыяльнасцях і спецыялізацыях эканамічнага і юрыдычнага профілю займаецца больш 15 тыс. студэнтаў вочнай і завочнай формаў навучання, у тым ліку замежныя студэнты з 18 краін свету. Іх адукацыяй займаюцца 776 выкладчыкаў і каля 100 навуковых супрацоўнікаў, у тым ліку акадэмікаў, членаў-карэспандэнтаў — 8 чалавек, 47 прафесараў, доктароў навук, 392 дацэнтаў, кандыдатаў навук.*

Сучасныя рэаліі мяняюць нашы арыенціры, прад'яўляюць сур'ёзныя патрабаванні да падрыхтоўкі не толькі больш адукаванага, але і дзелавога, ініцыятыўнага спецыяліста. Намаганні выкладчыцкага корпуса накіраваны на тое, каб у працэсе вучобы студэнты ў поўнай меры атрымалі фундаментальную і прафесійную падрыхтоўку, аваладалі эканамічнай тэорыяй, камп'ютэрнай тэхналогіяй, передавымі метадамі прафесійнай працы, былі высокакваліфікаванымі і высокаарганізаванымі асобамі, атрымалі агульнанавуковую і гуманітарную падрыхтоўку, аваладалі замежнымі мовамі.

Істотныя змяненні адбыліся і ў тэхналогіі навучання. Акцэнт тут зроблены на забеспячэнне сістэмнага ўзроўню пазнання, пераадольванне прадметнай адасобленасці, далейшага развіцця самастойнай працы студэнтаў, шырокае выкарыстанне актыўных формаў навучальнага працэсу, эфектыўных метадаў кантролю ведаў і дзяржаўнай атэстацыі выпускнікоў. Удасканальваецца практычная падрыхтоўка студэнтаў, распрацаваны новыя праграмы вучэбнай і вытворчай практык студэнтаў. Зроблены пераход на універсітэцкі пяцігадовы тэрмін навучання.



Узровень гэтых ведаў і дадатковая падрыхтоўка даюць магчымасць атрымаць не толькі вышэйшую адукацыю, але і акадэмічную ступень бакалаўра. Найбольш таленавітыя і працаздольныя студэнты маюць магчымасць прадоўжыць вучобу на магістарскім узроўні. Менавіта з іх фарміруецца вядучыя спецыялісты як для вытворчай, так і для навукова-даследчай сферы дзейнасці, адначасова з гэтым ствараюцца ўмовы для выхавання будучага патэнцыялу прафесарска-выкладчыцкіх кадраў, кіраўнікоў гаспадарчых і дзяржаўных структур. Для тых, хто цікавіцца перспектывай, не лішне будзе ведаць, што ва універсітэце плённа працуе аспірантура і дактарантура, ёсць саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Рэктарат, дэканаты, кафедры універсітэта за апошнія гады прыкметна змянілі змест і тэхналогію навучання. Акрамя вучэбных заняткаў ва аўдыторыях і лабараторыях студэнтаў чакае інтэнсіўная самастойная праца па аваладванню ведамі. Для гэтага шырока выкарыстоўваецца вопыт замежных краін. Ва універсітэце паспяхова вырашаецца праблема аваладвання студэнтамі замежнымі мовамі. З гэтай мэтай на працягу шасці апошніх гадоў абавязковым экзаменам для абітурыентаў з'яўляецца замежная мова. Акрамя таго, павялічана колькасць вучэбных гадзін для вывучэння замежных моў, працуюць тры кафедры і створана адпаведная матэрыяльная база. Актыўна прыцягваюцца да выкладання гэтага прадмету і замежныя спецыялісты.

Дагаворы аб навуковым і культурным супрацоўніцтве заключаны намі не толькі з ВНУ краін СНД, але і з універсітэтамі Германіі, Іспаніі, Францыі, Вялікабрытаніі, ЗША, Польшчы, Аўстрыі, Кітая і інш. Мы, напрыклад, цесна супрацоўнічаем з Вроцлаўскай эканамічнай акадэміяй, Лонданскім універсітэтам на Тэмзе, Шэфілдскім, Дортмундскім, Каліфарнійскім, Місурыйскім, Венскім эканамічнымі універсітэтамі. На цяперашні час дзейнічаюць 17 дагавораў аб супрацоўніцтве з ВНУ краін Еўропы і Амерыкі, СНД. З замежнымі ВНУ мы вядзем абмен студэнцкімі і выкладчыцкімі групамі, стажорамі-практыкантамі. У гэтым годдзе 32 студэнты нашага універсітэта працягваюць навучанне ў ЗША, Германіі, Англіі, Аўстрыі і іншых краінах. Вялікі праект па праграме "Тэмпус-Тасіс" сумесна рэалізуецца з ВНУ Іспаніі і Францыі, цікавае супрацоўніцтва склалася з Інстытутам кіравання Сарбонскага універсітэта (Парыж), у межах якога група студэнтаў БДЭУ адначасова навучаецца французскімі выкладчыкамі па іх праграмах. Адметна, што заняткі праводзяцца на французскай мове і па заканчэнню навучання выпускнікі атрымаюць сертыфікаты і дыпломы абодвух універсітэтаў. Вядзецца плённая праца па лініі фонда Ноу-Хау і Еўраазія з універсітэтам Сэрры у Вялікабрытаніі. Вельмі актыўна супрацоўнічае Вышэйшая школа кіравання і бізнесу і Вышэйшая школа турызму з ВНУ Германіі. За апошнія два гады ў нашым універсітэце пабывалі 204 замежных выкладчыкаў, якія прымалі актыўны ўдзел у навучальным працэсе.

Сучасныя патрабаванні развіцця эканомікі ставяць перад намі адказную задачу інтэнсіўнага пошуку не толькі новага зместу навучання па кожнай дысцыпліне, але і своечасовага перагляду тых спецыяльнасцяў і спецыялізацый, па якіх мы вядзем падрыхтоўку. Упершыню ў рэспубліцы адкрыта і значна пашырана падрыхтоўка спецыялістаў па знешнеэканамічнай і камерцыйнай дзейнасці, дзяржаўнаму і муніцыпальнаму кіраванню, маркетынгу, гаспадарчаму праву, эканоміцы і кіраванню турызмам.

Ва універсітэце створана і эфектыўна дзейнічае сістэма перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі спецыялістаў-практыкаў (на базе вышэйшай адукацыі) па праблемах рыначнай эканомікі і новага гаспадарчага механізма ў Вышэйшай школе кіравання і бізнесу, Вышэйшай школе турызму, нацыянальным цэнтры банкаўскай адукацыі сумесна з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і Банкаўскай акадэміяй (г. Франкфурт-на-Майне, ФРГ), мэтай якога з'яўляецца павышэнне кваліфікацыі банкаўскіх і фінансавых работнікаў з улікам патрабаванняў рынка, сучасных інфармацыйных тэхналогій, замежнага вопыту арганізацыі банкаўскага бізнесу і фінансавага менеджменту. Толькі за 1996—1998 гг. ва універсітэце атрымалі другую вышэйшую эканамічную адукацыю больш 1250 спецыялістаў, праведзена звыш 60 семінараў па рыначнай эканоміцы з шырокім прыцягненнем замежных спецыялістаў. 220 слухачоў прайшлі стажыроўку за мяжой.

Стварэнне матэрыяльнай базы, якая б адпавядала сучасным патрабаванням падрыхтоўкі спецыялістаў, — адна з галоўных, і разам з тым, складаных праблем сучаснага жыцця. Тым не менш, сёння універсітэт мае няддрэнныя ўмовы для правядзення вучэбнай і навуковай працы. У нашай ВНУ ёсць свой студэнцкі гарадок з пяццю вучэбна-лабараторнымі карпусамі і шасцю інтэрнатамі, сучасная бібліятэка са звыш мільённым кніжным фондам, якая лічыцца адной з буйнейшых профільных бібліятэк.

Асаблівы клопат у рэктарата выклікае забеспячэнне навучальнага працэсу сучаснымі тэхнічнымі сродкамі. Зараз ва універсітэце дзейнічаюць 33 камп'ютэрныя лабараторыі, створаны вучэбныя бухгалтэрыі і аўтаматызаваныя рабочыя месцы на базе ПЭВМ для менеджэраў, фінансістаў, банкаўскіх і камерцыйных работнікаў. Для інфармацыйнага забеспячэння выкарыстоўваецца міжнародная сетка "Internet".

Ва універсітэце створаны добрыя ўмовы для грамадскага харчавання, працуе гандлёвы комплекс у складзе некалькіх сталовых, кафэ, магазіна, буфетаў, кіёскаў. Для аздараўлення студэнтаў, супрацоўнікаў дзейнічае санаторый-прафілакторый, спартыўны клуб, летняя база адпачынку на Вілейскім вадасховішчы, створаны добрыя ўмовы для заняткаў фізкультурай і спортам, мастацкай самадзейнасцю.

*За гады работы нашай ВНУ падрыхтавана больш за 60 тысяч спецыялістаў, якія працуюць ва ўсіх галінах гаспадаркі і займаюць разнастайныя пасады ад радавых эканамістаў да кіраўнікоў міністэрстваў, ведамстваў, банкаў, буйных камерцыйных структур.*

*Калектыў універсітэта бачыць сваю задачу ў тым, каб за гады вучобы сфарміраваць творчага, адукаванага, думаючага спецыяліста, які б адпавядаў патрабаванням не толькі сённяшняга дня, але, у перспектыве, мог вырашаць складаныя пытанні развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь.*

***Р.Карсека, прафесар, рэктар універсітэта***

**На здымках: універсітэцкі гарадок; навучальны корпус N 5 па вуліцы Свярдлова, 7.**
***Фота А.Лабады.***

# ПЛАН ПРЫЁМУ НА 1999 год

| Шыфр | Факультэты, спецыяльнасці і спецыялізацыі | Усяго | Дзённае | | Завочнае |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Усяго | у тым ліку па кантракту | |
| | **ФАКУЛЬТЭТ МЕНЕДЖМЕНТУ** | | | | |
| Э.01.02.00 | Дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне | 40 | 20 | — | 20 |
| Э.01.03.00 | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве прамысловасці | 60 | 40 | 12 | 20 |
| Э.01.03.14 | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве аграпрамысловага комплексу | 65 | 40 | — | 25 |
| Н.08.03.00 | Эканамічная кібернетыка | 20 | 20 | — | — |
| | **ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІНАЎ** | | | | |
| Э.01.08.01 | Эканоміка і кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю | 80 | 60 | — | 20 |
| | **ФАКУЛЬТЭТ ПРАВА** | | | | |
| Г.09.01.02 | Гаспадарча-прававая | 50 | 30 | — | 20 |
| Г.09.01.08 | Прававое забеспячэнне знешнеэканамічнай дзейнасці | 20 | 20 | — | — |
| | **ФАКУЛЬТЭТ БАНКАЎСКАЙ СПРАВЫ** | | | | |
| Э.01.04.02 | Крэдыт | 75 | 40 | — | 35 |
| Э.01.07.07 | Улік, аналіз і аўдыт у банках | 30 | 30 | — | 15 |
| | **УЛІКОВА-ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ** | | | | |
| Э.01.07.02 | Улік, аналіз і аўдыт у аграпрамысловым комплексе | 65 | 40 | — | 25 |
| Э.01.07.05 | Улік, аналіз і аўдыт у гандлі | 50 | 30 | — | 20 |
| Э.01.07.09 | Улік, аналіз і аўдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці | 15 | 15 | — | — |
| | **ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ** | | | | |
| Э.01.04.01 | Фінансы | 75 | 45 | 20 | 30 |
| Э.01.04.03 | Страхаванне | 20 | 20 | 8 | — |
| Э.01.04.05 | Фінансы і крэдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці | 20 | 20 | — | — |
| | **ФАКУЛЬТЭТ УЛІКУ І СТАТЫСТЫКІ** | | | | |
| Э.01.06.00 | Статыстыка | 50 | 25 | — | 25 |
| Э.01.07.01 | Улік, аналіз і аўдыт у прамысловасці | 90 | 50 | 6 | 40 |
| Э.01.07.04 | Улік, аналіз і аўдыт у будаўніцтве | 50 | 30 | — | 20 |
| Э.01.07.08 | Улік, аналіз і аўдыт у бюджэтных і навуковых установах | 45 | 25 | 7 | 20 |
| | **ФАКУЛЬТЭТ ЭКАНОМІКІ І КІРАВАННЯ ГАНДЛЕМ** | | | | |
| Э.02.01.01 | Камерцыйная дзейнасць на рынку паслуг (грамадскае харчаванне) | 40 | 20 | — | 20 |
| Э.02.01.10 | Камерцыйная дзейнасць на знешнім рынку | 15 | 15 | — | — |
| Э.02.01.12 | Камерцыйная дзейнасць і таваразнаўства нехарчовых тавараў | 40 | 20 | — | 20 |
| Э.02.01.13 | Камерцыйная дзейнасць і таваразнаўства харчовых тавараў | 40 | 20 | — | 20 |
| Э.02.01.14 | Камерцыйная дзейнасць на рынку тавараў народнага спажывання | 50 | 30 | — | 20 |
| | **ФАКУЛЬТЭТ МАРКЕТЫНГУ** | | | | |
| Э.02.02.00 | Маркетынг | 40 | 20 | — | 20 |
| Э.02.02.04 | Кіраванне забеспячэннем і збытам | 50 | 30 | — | 20 |
| Э.02.02.06 | Цэнаўтварэнне | 40 | 20 | — | 20 |
| | **ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА ТУРЫЗМУ** | | | | |
| Э.01.05.02 | Эканоміка і кіраванне турызмам | 40 | 20 | — | 20 |
| Э.01.05.03 | Эканоміка і кіраванне гасцінічнай і рэстараннай гаспадаркай | 40 | 20 | — | 20 |
| | **На скарочаны тэрмін дзённага навучання** | | | | |
| Э.01.04.01 | Фінансы | 25 | 25 | — | — |
| Э.01.07.01 | Улік, аналіз і аўдыт у прамысловасці | 20 | 20 | — | — |
| Э.01.07.02 | Улік, аналіз і аўдыт у аграпрамысловым комплексе | 20 | 20 | — | — |
| Э.01.07.05 | Улік, аналіз і аўдыт у гандлі | 20 | 20 | — | — |
| Э.01.04.02 | Крэдыт | 20 | 20 | — | — |
| | **БАБРУЙСКІ ФІЛІЯЛ** | | | | |
| Э.01.03.00 | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве прамысловасці | 15 | 15 | — | — |
| Э.01.07.01 | Улік, аналіз і аудыт у прамысловасці | 15 | 15 | — | — |
| | **Усяго** | **1450** | **950** | **68** | **500** |

# ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

## У Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт на 1999 год

1. Ва універсітэт для атрымання першай бясплатнай вышэйшай адукацыі на конкурснай аснове прымаюцца: грамадзяне Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі; асобы, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі рэспублікі; беларусы замежжа. Жыхары іншых дзяржаў паступаюць ва універсітэт на падставе міждзяржаўных пагадненняў або дагавораў з аплатай кошту навучання юрыдычнымі або фізічнымі асобамі.

2. Звыш вызначаных лічбаў прыёму універсітэт ажыццяўляе прыём студэнтаў па ўсіх формах навучання на падставе дагавораў з аплатай юрыдычнымі або фізічнымі асобамі. На звышпланавыя месцы, колькасць якіх вызначаецца прыёмнай камісіяй, па конкурсе могуць залічвацца: абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя іспыты, але не прайшлі па конкурсе ва універсітэт ці іншую дзяржаўную вышэйшую навучальную ўстанову, пры ўмове адпаведнасці ўступных іспытаў незалежна ад іх формы (вусна ці пісьмова); абітурыенты, якія станоўча прайшлі субяседаванне па прадметах уступных экзаменаў.

***3. На дзённую форму навучання дакументы прымаюцца з 26 чэрвеня па 15 ліпеня, уступныя экзамены праводзяцца з 16 ліпеня па 31 ліпеня, залічэнне ў склад студэнтаў па плану — да 5 жніўня, на ўмовах аплаты — да 25 жніўня.***

***На навучанне без адрыву ад вытворчасці прыём дакументаў праводзіцца з 21 чэрвеня па 15 ліпеня, экзамены — з 2 жніўня, залічэнне па плану — да 15 жніўня, на ўмовах аплаты — да 25 жніўня.***

4. Паступаючыя ва універсітэт падаюць у прыёмную камісію ці дасылаюць па пошце наступныя дакументы: заяву ўстаноўленага ўзору на імя рэктара; дакумент дзяржаўнага ўзору аб сярэдняй адукацыі у арыгінале; медыцынскую даведку па форме 086У; выпіску з працоўнай кніжкі (для тых, хто працуе); даведку службы занятасці насельніцтва (для тых, хто знаходзіцца на яе ўліку); 6 чорна-белых фотакартак памерам 3х4. Абітурыенты, якія паступаюць не ў год атрымання сярэдняй адукацыі, абавязаны прадставіць дакументы, якія пацвярджаюць іх вучобу ці работу за гады, якія папярэднічалі паступленню (дыплом, выпіска з працоўнай кніжкі або даведка службы занятасці насельніцтва ці іншае). Могуць быць прадстаўлены дакументы, якія пацвярджаюць права абітурыентаў на льготы, устаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, ці сведчаць аб асабістых талентах і здольнасцях абітурыентаў. Пашпарт або іншае сведчанне асобы, выдадзенае органамі МУС, прад'яўляецца абітурыентам асабіста.

5. Універсітэт забяспечвае захоўванне правоў грамадзян на адукацыю, якія прадугледжаны заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, галоснасць і адкрытасць работы прыёмнай камісіі, аб'ектыўнасць ацэнкі ведаў, здольнасцяў і схільнасцяў абітурыентаў.

6. Паступаючыя ва універсітэт на ўсе спецыяльнасці здаюць уступныя экзамены па матэматыцы (пісьмова), замежнай мове (вусна), беларускай мове і літаратуры ці рускай мове і літаратуры (сачыненне) па выбары.

Уступныя іспыты па замежнай мове (англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай) абітурыенты могуць здаваць па выбары, незалежна ад таго, якую замежную мову яны вывучалі ў сярэдняй навучальнай установе.

7. Уступныя іспыты праводзяцца па праграмах, якія складзены ў адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаны Міністэрствам адукацыі. Расклад уступных экзаменаў абвяшчаецца за тыдзень да пачатку іх правядзення.

***8. Вынікі ўступных экзаменаў ацэньваюцца адзнакамі "5" (пяць), "4,5" (чатыры з паловай), "4" (чатыры), "3,5" (тры з паловай), "3" (тры), "2" (два).***

***9. Абітурыенты, якія скончылі сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную ўстанову з медалем, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай, прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, паступаючыя на ўсе спецыялізацыі, здаюць экзамен па матэматыцы. Паступаючыя на спецыялізацыі "Эканоміка і кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю", "Фінансы і крэдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці", "Улік, аналіз і аўдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці", "Камерцыйная дзейнасць на знешнім рынку", "Прававое забеспячэнне знешнеэканамічнай дзейнасці", "Эканоміка і кіраванне турызмам", "Эканоміка і кіраванне гасцінічнай і рэстараннай гаспадаркай"дадаткова здаюць экзамен па замежнай мове.***

Пры атрыманні адзнак(і) "пяць" абітурыенты вызваляюцца ад далейшай здачы ўступных экзаменаў, а пры атрыманні іншых станоўчых адзнак здаюць астатнія экзамены.

***10. Без уступных экзаменаў ва універсітэт залічваюцца: пераможцы (1-е месца) рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд выпускнікоў школ па матэматыцы альбо замежнай мове, праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1998/1999 навучальным годзе; пераможцы (1-е, 2-е, 3-е месцы) рэспубліканскай алімпіяды па эканоміцы, праведзенай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам у 1998-1999 гадах.***

11. Пераможцы (2-е, 3-е месцы) рэспубліканскіх і міжнародных, (1-е, 2-е, 3-е месцы) абласных і Мінскага гарадскога тураў алімпіяд выпускнікоў школ па матэматыцы, замежнай мове, беларускай мове і літаратуры ці рускай мове і літаратуры, праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1998/1999 навучальным годзе, вызваляюцца ад уступных экзаменаў па адпаведнаму прадмету з выстаўленнем адзнакі "пяць".

12. Абітурыенты, якія не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да здачы далейшых экзаменаў не дапускаюцца. Пераздача ўступных экзаменаў не дазваляецца.

13. Абгрунтаваная апеляцыя па пытанню экзаменацыйнай адзнакі падаецца абітурыентам у дзень правядзення вуснага або ў дзень абвяшчэння адзнакі па пісьмовым экзамене. Заявы падаюцца на імя адказнага сакратара прыёмнай камісіі і разглядаюцца апеляцыйнай камісіяй у складзе адказнага сакратара альбо яго намесніка, старшыні прадметнай камісіі і члена прадметнай камісіі.

***14. Залічэнне ва універсітэт па дзённай форме навучання на ўсе спецыяльнасці і спецыялізацыі, акрамя спецыяльнасцей (спецыялізацый), па якіх ажыццяўляецца мэтавая кантрактная падрыхтоўка, праводзіцца па асобным конкурсе сярод выпускнікоў гарадскіх і сельскіх школ прапарцыянальна пададзеным заявам у адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на конкурсных уступных іспытах. У тых выпадках, калі конкурсны бал сярод выпускнікоў сельскіх школ перавышае конкурсны бал сярод выпускнікоў гарадскіх школ, залічэнне праводзіцца па агульным конкурсе.***

15. На навучанне без адрыву ад вытворчасці па конкурсе ў першую чаргу залічваюцца абітурыенты, якія маюць сярэднюю спецыяльную ці прафесійна-тэхнічную адукацыю з атрыманнем сярэдняй адукацыі або стаж практычнай работы не менш за 6 месяцаў і паступаюць на адпаведныя ці роднасныя спецыяльнасці.

Колькасць іншых асоб, якія залічаны па дадзенай спецыяльнасці, не павінна перавышаць 20% ад кантрольных лічбаў прыёму.

16. Выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення залічваюцца на завочную форму навучання згодна адпаведнаму палажэнню.

***16. Залічэнне ў Бабруйскі філіял праводзіцца па асобным конкурсе ў адпаведнасці з дадзенымі Правіламі прыёму.***

17. Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых ацэнак на ўступных іспытах па ўсіх формах навучання залічваюцца:

— воіны-інтэрнацыяналісты;

— дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў;

— дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, або рабочых і служачых, што займалі штатныя пасады ў воінскіх часцях, загінуўшых (памершых) ці стаўшых інвалідамі ў час праходжання ваеннай службы або працы ў складзе савецкіх войскаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем`яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памершых) у мірны час пры праходжанні службы;

— дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, загінуўшых (памершых) або стаўшых інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама загінуўшых (памершых) у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў;

— інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ва універсітэце і якія могуць наведваць заняткі;

— асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.18 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС". Абітурыенты гэтай катэгорыі, якія скончылі навучальныя ўстановы з адзнакай (з выдатнымі ацэнкамі), залічваюцца па выніках субяседавання;

— суайчыннікі з іншых краін па рэкамендацыях беларускіх суполак ці навучальных устаноў замежжа на спецыяльна вылучаныя месцы.

18. Пры роўнай колькасці балаў у першую чаргу залічваюцца:

інваліды 3-й групы, пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў для навучання ва універсітэце;

асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з артыкуламі 19, 20, 23, 24, 25 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей;

асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў;

скончыўшыя сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай, прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай;

маючыя большы стаж работы па абранай спецыяльнасці;

прайшоўшыя навучанне прафесійнага напрамку (тэхнікумы, вучылішчы, гімназіі, ліцэі, каледжы, спецыялізаваныя школы, падрыхтоўчыя курсы пры БДЭУ);

маючыя больш высокія балы ў атэстаце (дыпломе) па прадметах уступных экзаменаў;

маючыя больш высокі сярэдні бал у атэстаце (дыпломе).

19. Асобы, якія скончылі сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову па спецыяльнасцях "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт", "Фінансы", "Банкаўская справа" з дыпломам з адзнакай, залічваюцца ва універсітэт на дзённую форму са скарочаным тэрмінам навучання па адпаведных спецыялізацыях на падставе вынікаў субяседавання па прадметах уступных экзаменаў у адпаведнасці з палажэннем, зацверджаным прыёмнай камісіяй.

20. Асобы, якія скончылі сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай, прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, могуць залічвацца на дзённую форму навучання звыш кантрольных лічбаў прыёму з поўнай аплатай кошту навучання на падставе вынікаў субяседавання ў адпаведнасці з палажэннем, зацверджаным прыёмнай камісіяй. Заявы прымаюцца да 7 жніўня, субяседаванне праводзіцца 9 жніўня.

21. Асобы, якія маюць адпаведную сярэднюю спецыяльную адукацыю і працуюць па спецыяльнасці, выпускнікі адпаведных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і паступаючыя на завочную форму навучання, могуць залічвацца па ўсіх спецыяльнасцях на адпаведна выдзеленыя месцы на падставе вынікаў субяседавання. Субяседаванне праводзіцца па дысцыплінах уступных экзаменаў на падставе палажэння, зацверджанага прыёмнай камісіяй. ***На завочную форму навучання звыш кантрольных лічбаў прыёму могуць паступаць па субяседаванню таксама абітурыенты, якія маюць сярэднюю адукацыю і працуюць па спецыяльнасці. Заявы прымаюцца да 7 жніўня, субяседаванне праводзіцца з 10 па 12 жніўня.***

22. Для атрымання другой вышэйшай адукацыі па дзённай і завочнай формах навучання могуць прымацца асобы на ўмовах аплаты кошту навучання згодна адпаведнаму палажэнню. Пытанне аб залічэнні такіх асоб на другі або старэйшыя курсы вырашаецца дэканам адпаведнага факультэта і канчаткова зацвярджаецца загадам рэктара. Пры немагчымасці залічэння на другі або старэйшыя курсы ў сувязі з неадпаведнасцю пройдзеных дысцыплін або патрабаванняў праграмы, жадаючыя атрымаць другую адукацыю паступаюць на першы курс па выніках субяседавання па дысцыплінах уступных экзаменаў.

23. На асобныя спецыяльнасці і спецыялізацыі па дзённай форме навучання можа ажыццяўляцца прыём абітурыентаў на ўмовах мэтавай кантрактнай падрыхтоўкі спецыялістаў згодна плану мэтавага набору, зацверджанаму Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Прыём праводзіцца на падставе адпаведнага палажэння.

24. Усе пытанні, звязаныя з прыёмам ва універсітэт, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй. ***Тэлефон 249-41-37.***

# На дзённай форме навучання

### I. Агульныя палажэнні

1. Субяседаванне праводзіцца ў мэтах вызначэння ўзроўню ведаў абітурыентаў, а таксама выяўлення схільнасцяў да навучання па адпаведнай спецыяльнасці. Субяседаванне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з п. 4, 7, 14 Парадку прыёму у дзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь на 1999 год.

2. Субяседаванне праводзіцца з абітурыентамі, паступаючымі на дзённую форму навучання па спецыяльнасцях "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт" (спецыялізацыі: "Улік, аналіз і аўдыт у гандлі", "Улік, аналіз і аўдыт у аграпрамысловым комплексе", "Улік, аналіз і аўдыт у прамысловасці"), "Фінансы і крэдыт" (спецыялізацыі "Крэдыт", "Фінансы") са скарочаным тэрмінам навучання.

3. Да субяседавання дапускаюцца:

3.1. Пры паступленні ў межах бюджэтнага фінансавання:

3.1.1. Выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў па спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт" (спецыялізацыі: "Улік, аналіз і аўдыт у гандлі", "Улік, аналіз і аўдыт у аграпрамысловым комплексе", "Улік, аналіз і аўдыт у прамысловасці"), атрымаўшыя дыплом з адзнакай і маючыя рэкамендацыю педагагічнага Савета на скарочаны тэрмін навучання.

3.1.2. Выпускнікі Мінскага фінансава-эканамічнага каледжа па спецыяльнасці "Фінансы" (спецыялізацыі: "Падаткі і падаткаабкладанне", "Бюджэт і бюджэтны ўлік", "Страхаванне", "Банкаўская справа"), атрымаўшыя дыплом з адзнакай і маючыя рэкамендацыю педагагічнага Савета на скарочаны тэрмін навучання.

3.1.3. Выпускнікі Пінскага банкаўскага каледжа па спецыяльнасці "Банкаўская справа", атрымаўшыя дыплом з адзнакай і маючыя рэкамендацыю педагагічнага Савета на скарочаны тэрмін навучання.

3.2. Пры паступленні звыш кантрольных лічбаў прыёму на падставе дагавораў з аплатай кошту навучання юрыдычнымі або фізічнымі асобамі:

3.2.1. Выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў па спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт" (спецыялізацыі: "Улік, аналіз і аўдыт у прамысловасці", "Улік, аналіз і аўдыт у гандлі", "Улік, аналіз і аўдыт у аграпрамысловым комплексе"), не маючыя ў дыпломе здавальняючых адзнак і паступаючыя на адпаведную спецыялізацыю;

3.2.2. Выпускнікі Мінскага фінансава-эканамічнага каледжа па спецыяльнасці "Фінансы" (спецыялізацыі: "Падаткі і падаткаабкладанне", "Бюджэт і бюджэтны ўлік", "Страхаванне", "Банкаўская справа"), не маючыя ў дыпломе здавальняючых адзнак і паступаючыя на адпаведную спецыялізацыю.

3.2.3. Выпускнікі Пінскага банкаўскага каледжа па спецыяльнасці "Банкаўская справа", не маючыя ў дыпломе здавальняючых адзнак і паступаючыя на адпаведную спецыялізацыю.

3.2.4. Асобы, якія скончылі сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай, прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай.

### II. Парадак правядзення субяседавання

1. Абітурыенты, якія скончылі сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай, прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, праходзяць субяседаванне па матэматыцы. Пры атрыманні адзнакі "пяць" яны вызваляюцца ад далейшага субяседавання, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — праходзяць субяседаванне па беларускай (рускай) мове і літаратуры па выбары, замежнай мове.

2. Субяседаванне праводзіцца ў наступныя тэрміны:

2.1. З паступаючымі звыш кантрольных лічбаў прыёму — 9 жніўня.

2.2. З паступаючымі ў межах бюджэтнага фінансавання — 9 ліпеня.

3. Пытанні для правядзення субяседавання складаюцца экзаменацыйнымі камісіямі ў адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі.

4. Субяседаванне праводзіцца камісіяй у складзе двух экзаменатараў па кожнай дысцыпліне, якую ўзначальвае член прыёмнай камісіі .

5. Абітурыенту прапануецца 5 пытанняў па кожнай дысцыпліне, якія ацэньваюцца баламі ад 0 да 5.

6. Асобы, якія атрымалі 0 балаў па аднаму з прадметаў, да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца.

7. Пытанні абітурыентам і адказы на іх фіксуюцца ў лістах вуснага адказу ў экзаменацыйных лістах, падпісваюцца членамі камісіі, якая праводзіла субяседаванне.

8. Апеляцыя падаецца абітурыентам у дзень правядзення субяседавання і разглядаецца ва ўстаноўленым парадку.

9. Лісты вуснага адказу захоўваюцца ў асабістых справах абітурыентаў.

### III. Парадак залічэння па выніках субяседавання

1. Залічэнне ў склад студэнтаў у межах бюджэтнага фінансавання праводзіцца па конкурсе ў адпаведнасці з Правіламі прыёму.

2. Абітурыенты, якія не залічаны ў склад студэнтаў па выніках субяседавання ў межах бюджэтнага фінансавання, маюць права:

— здаваць уступныя экзамены і ўдзельнічаць у конкурсе на агульных падставах:

— быць залічанымі звыш плану прыёму на дзённае і завочнае навучанне па адпаведнай спецыяльнасці на падставе дагавораў з аплатай кошту навучання;

— удзельнічаць у конкурсе з атрыманымі баламі для залічэння на завочную форму навучання па адпаведнай спецыяльнасці, пры ўмове наяўнасці дагавора з частковай кампенсацыяй дадатковых паслуг на навучанне, заключанага паміж універсітэтам і прадпрыемствам (арганізацыяй, установай).



*У нашым універсітэце займаюцца і замежныя студэнты. Для іх адчынена падрыхтоўчае аддзяленне, дзе яны ўдасканальваюць не толькі рускую мову, але і іншыя дысцыпліны, па якіх хутка давядзецца здаваць экзамены. Кансультацыі па матэматыцы праводзяць выкладчыкі кафедры вышэйшай матэматыкі на чале з загадчыкам С.А.Самалём.*

*Фота М.Лявонава.*

# На завочнай форме навучання

### I. Агульныя палажэнні

1. Субяседаванне праводзіцца ў мэтах вызначэння ўзроўню ведаў абітурыентаў, развіцця дагаворных адносінаў з прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі, а таксама выяўлення схільнасцяў да навучання па адпаведнай спецыяльнасці. Субяседаванне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з п. 4, 7, 14 Парадку прыёму ў дзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы на 1999 год.

2. Субяседаванне праводзіцца з абітурыентамі, паступаючымі на завочную форму навучання па ўсіх спецыяльнасцях і спецыялізацыях.

3. Да субяседавання дапускаюцца:

3.1. Пры паступленні ў межах бюджэтнага фінансавання:

3.1.1. Асобы, якія маюць адпаведную сярэднюю спецыяльную адукацыю і працуюць па спецыяльнасці.

3.1.2. Выпускнікі бягучага года адпаведных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

3.2. Пры паступленні звыш кантрольных лічбаў прыёму на падставе дагавораў з аплатай кошту навучання юрыдычнымі альбо фізічнымі асобамі:

3.2.1. Выпускнікі бягучага года адпаведных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

3.2.2. Асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і працуюць па спецыяльнасці.

4. Падставай для правядзення субяседавання з паступаючымі ў межах бюджэтнага фінансавання з`яўляецца дагавор з частковай кампенсацыяй дадатковых паслуг на навучанне, заключаны паміж універсітэтам і прадпрыемствам (арганізацыяй, установай).

5. Колькасць абітурыентаў, якія могуць быць залічаны па субяседаванню ў межах бюджэтнага фінансавання, не павінна перавышаць 60% ад плану прыёму.

### II. Парадак правядзення субяседавання

1. Субяседаванне праводзіцца ў вуснай форме па дысцыплінах уступных экзаменаў у наступныя тэрміны:

1.1.3. З паступаючымі ў межах бюджэтнага фінансавання — з 10 па 24 ліпеня.

1.2.3. З паступаючымі звыш кантрольных лічбаў прыёму — з 10 па 12 жніўня.

2. Абітурыенты, якія скончылі сярэднюю навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай, праходзяць субяседаванне па матэматыцы. З паступаючымі на спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю", "Эканоміка і кіраванне турызмам", "Эканоміка і кіраванне гасцінічнай і рэстаранная гаспадаркай", дадаткова праводзіцца субяседаванне па замежнай мове. Пры атрыманні адзнак(і) "пяць" яны вызваляюцца ад далейшага субяседавання, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — праходзяць субяседаванне па беларускай (рускай) мове і літаратуры па выбары, замежнай мове.

3. Пытанні для правядзення субяседавання складаюцца экзаменацыйнымі камісіямі ў адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі.

4. Субяседаванне праводзіцца камісіяй у складзе двух экзаменатараў па кожнай дысцыпліне, якую ўзначальвае член прыёмнай камісіі.

5. Абітурыенту прапануецца 5 пытанняў па кожнай дысцыпліне, якія ацэньваюцца ад 0 да 5 балаў.

6. Асобы, якія атрымалі 0 балаў па аднаму з прадметаў, да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца.

7. Пытанні абітурыентам і адказы на іх фіксуюцца ў лістах вуснага адказу ў экзаменацыйных лістах, падпісваюцца членамі камісіі, якая праводзіла субяседаванне.

8. Апеляцыя падаецца абітурыентам у дзень правядзення субяседавання і разглядаецца ва ўстаноўленым парадку.

9. Лісты вуснага адказу захоўваюцца ў асабістых справах абітурыента.

### III. Парадак залічэння па выніках субяседавання

1. Залічэнне ў склад студэнтаў у межах бюджэтнага фінансавання праводзіцца на конкурснай аснове ў адпаведнасці з Правіламі прыёму.

2. Асобы, якія не залічаны па выніках субяседавання у межах бюджэтнага фінансавання, маюць права здаваць уступныя экзамены і ўдзельнічаць у конкурсе на агульных падставах, або могуць быць залічаны на дзённую і завочную форму навучання звыш плану прыёму на падставе дагавораў з аплатай кошту навучання.

# ПОЛОЖЕНИЕ

## о целевой контрактной подготовке специалистов с изменениями и дополнениями, утвержденными приказом министра образования от 06.02.98 г. № 50

***Положение разработано в соответствии с Законом "Об образовании в Республике Беларусь", Законом "О занятости населения Республики Беларусь", положениями об учебных заведениях, нормативными документами Министерства образования и науки.***

Целевая контрактная подготовка специалистов осуществляется для удовлетворения потребности в специалистах районов, пострадавших в результате аварии на Чернобыльской АЭС, сельских районов, социально значимых отраслей народного хозяйства, а также для повышения социальной защищенности выпускников учебных заведений, оказания им реальной помощи в трудоустройстве в условиях перехода к рыночным отношениям.

Целевая подготовка специалистов на основе контрактов осуществляется в государственных высших и средних специальных учебных заведениях, финансируемых за счет средств бюджета, в пределах контрольных цифр, устанавливаемых в Прогнозе социального и экономического развития Республики Беларусь, а также в учебных заведениях Белкоопсоюза, на целевую подготовку специалистов.

***Прием на целевую контрактную подготовку осуществляется по отдельному конкурсу.***

Основанием для участия абитуриентов в конкурсе на целевое контрактное место является заявление абитуриента и оформленный со стороны абитуриента и заказчика контракт. Для лиц в возрасте до 18 лет необходимо наличие письменного согласия одного из родителей (усыновителя или попечителя), подпись которого должна быть заверена заказчиком. Количество заявлений, подаваемых для участия в конкурсе на целевое контрактное место, не ограничивается.

При отсутствии конкурса на контрактные целевые места приемным комиссиям учебных заведений разрешается в сроки, установленные Правилами приема, принимать от абитуриентов, поступающих в данное учебное заведение на общих основаниях, документы, предусмотренные настоящим пунктом, для поступления на условиях целевой контрактной подготовки.

При отсутствии достаточного количества желающих обучаться по контракту из числа лиц, успешно сдавших вступительные экзамены в данное учебное заведение, по решению приемной комиссии контракты могут заключаться с лицами, успешно сдавшими вступительные экзамены по таким же предметам в другие высшие учебные заведения, в том числе и негосударственные.

Зачисление на целевые контрактные места лиц, поступавших на общих основаниях и не изъявивших желания заключать контракт, запрещается.

Трехсторонний контракт на целевую подготовку специалистов заключается между гражданином, принимаемым на обучение учебным заведением и заказчиком специалистов в соответствии с законодательством Республики Беларусь по форме, приведенной в Приложении 2.

По поручению заказчиков контракты могут быть подписаны уполномоченными лицами, которые направляются в учебные заведения для проведения собеседования с поступающими на обучение на контрактной основе.

Лица, обучающиеся по контракту, имеют равные обязанности и пользуются равными правами с лицами, зачисленными по конкурсу, если иное не оговорено в контракте. После окончания учебного заведения они направляются на работу в соответствии с контрактом.

Контракт может быть расторгнут по инициативе любой из сторон. Сторона, инициирующая расторжение контракта, обязана письменно уведомить об этом другие стороны с указанием причин. Контракт считается расторгнутым по соглашению сторон, если ни одна из них в течение месяца с момента получения уведомления письменно не выразит своего несогласия.

Контракт может быть расторгнут по инициативе учебного заведения только в случае отчисления лица, обучающегося по контракту, в связи с невыполнением учебного плана или по другим основаниям, предусмотренным учебным планом и Уставом учебного заведения.

Гражданин, заключивший контракт, возмещает затраченные на целевую подготовку денежные средства в следующих случаях:

— при отчислении из учебного заведения по причинам академической неуспеваемости, нарушений Правил внутреннего распорядка;

— при отказе от отправления на работу, согласно заключенному контракту, неприбытии к месту распределения или увольнения с места работы без отработки установленного в контракте срока.

***Более подробно с Положением о целевой контрактной подготовке специалистов можно ознакомиться в приемной комиссии.***

# Прадстаўляем факультэты

***Факультэт міжнародных эканамічных адносінаў — адзін з маладых, але дастаткова вядомых і аўтарытэтных структур Эканамічнага універсітэта. Факультэт рыхтуе спецыялістаў па спецыяльнасці: "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны" са спецыялізацыяй "Эканоміка і кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю".***

***Па гэтай спецыяльнасці да будучага спецыяліста прад'яўляюцца высокія патрабаванні ў прафесійнай, моўнай і камп'ютэрна-інфармацыйнай падрыхтоўцы.***

## Факультэт міжнародных эканамічных адносінаў

Падрыхтоўку спецыялістаў у галіне міжнародных эканамічных адносінаў факультэт пачаў першым на Беларусі. Уся метадычна-навучальная база факультэта стваралася з выкарыстаннем лепшых дасягненняў у гэтай галіне ВНУ былога СССР: Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных эканамічных адносінаў, Акадэміі Знешняга Гандлю, Дыпламатычнай Акадэміі.

Актыўную дапамогу ў арганізацыі вучэбнага працэсу на факультэце аказваюць зараз Міністэрства замежных спраў Беларусі, вядучыя камерцыйныя банкі, дзяржаўныя і прыватныя прадпрыемствы, зацікаўленыя ў развіцці знешнеэканамічных сувязей.

Можна без перабольшвання сказаць, што факультэт зараз валодае лепшым у рэспубліцы вопытам у падрыхтоўцы кадраў у галіне міжнародных эканамічных адносінаў.

На факультэце працуюць вопытныя прафесары, дацэнты і магістры, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку ў вядучых навучальных цэнтрах краін блізкага і далёкага замежжа. Да навучальнага працэсу актыўна прыцягваюцца замежныя прафесары і спецыялісты-практыкі, якія чытаюць курсы на замежных мовах па розных эканамічных праблемах.

Нашы выпускнікі дасканала валодаюць метадамі міжнароднага маркетынгу, макра- і мікраэканамічнага аналізу, ведаюць заканамернасці развіцця інфраструктуры знешніх эканамічных сувязей, механізма цэнаўтварэння на нацыянальным і міжнародным рынку.

Акрамя гэтага, будучыя эканамісты-міжнароднікі атрымаюць веды ў галіне бухгалтарскага ўліку, будуць вывучаць менеджмент, фінансы, крэдытна-разліковыя аперацыі ў знешнеэканамічнай дзейнасці, страхаванне ў знешнеэканамічнай дзейнасці, малы бізнес, інфармацыйныя тэхналогіі ў знешнеэканамічнай дзейнасці.

Вялікая ўвага надаецца моўнай падрыхтоўцы студэнтаў, бо яны павінны ведаць не менш дзвюх моў. У гэтым ім дапамагаюць кваліфікаваныя выкладчыкі, якія праводзяць заняткі ў лінгафонных кабінетах і лабараторыях з выкарыстаннем відэатэхнікі і спадарожнікавага тэлебачання.

Студэнты, якія вывучаюць французскую мову, маюць магчымасць атрымаць адначасова з дыпломам БДЭУ і дыплом Парыжскага інстытута кіравання пры Сарбоне. Для гэтага на факультэце створана франкамоўнае аддзяленне, дзе выкладанне эканамічных дысцыплін ажыццяўляецца выключна на французскай мове прафесарамі з Францыі.

Добрае валоданне сучаснай электронна-вылічальнай тэхнікай студэнты набываюць у спецыяльных камп'ютэрных класах, абсталяваных сучаснымі мадэлямі персанальных ЭВМ.

На факультэце дзейнічае Палажэнне аб рэйтынгавай ацэнцы ведаў, асноўная мэта якога — умацаваць залежнасць выніковай экзаменацыйнай адзнакі ад штодзённай працы студэнтаў на працягу семестра; павысіць аб'ектыўнасць выніковай экзаменацыйнай адзнакі; даць экзаменатару магчымасць усеагульна ўлічыць вынікі навучання студэнта ў семестры; умацніць зацікаўленасць студэнта да сістэмнай працы па засваенню вучэбнага матэрыялу на працягу ўсяго семестру. Згодна з гэтым Палажэннем, адзнака ў заліковую кніжку на экзамене выстаўляецца з улікам усёй папярэдняй працы студэнта ў семестры.

Факультэт арганізуе рэгулярныя сустрэчы студэнтаў і выкладчыкаў з кіруючымі асобамі пасольстваў ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Германіі, а таксама прадстаўнікамі Міжнароднага Валютнага Фонду, Сусветнага Банку і іншых міжнародных арганізацый.

Некаторыя студэнты прайшлі ці працягваюць навучанне ў ЗША, Германіі, Францыі, Аўстрыі, Ірландыі, Румыніі і Кітаі. Паколькі ўзровень выкладання замежных моў вельмі высокі, лепшыя студэнты факультэта перамагаюць у самых прэстыжных рэспубліканскіх конкурсах і выпрабаваннях на атрыманне грантаў і стажыровак за мяжой.

Выпускнікі факультэта працуюць у Міністэрстве замежных спраў і іншых вышэйшых дзяржаўных органах, у валютна-фінансавых упраўленнях буйнейшых банкаў і фінансавых карпарацый, у знешнегандлёвых фірмах вядучых беларускіх прадпрыемстваў-экспарцёраў, у сумесных прадпрыемствах і прадстаўніцтвах замежных фірмаў і міжнародных арганізацый.

Калектыў факультэта чакае дапытлівую, працавітую і цікавую моладзь.

## Фінансава-эканамічны факультэт

***Фінансава-эканамічны факультэт, як самастойнае падраздзяленне былога інстытута народнай гаспадаркі, быў створаны ў 1964 годзе. На гэтым факультэце праходзілі падрыхтоўку студэнты па спецыяльнасці "Фінансы і крэдыт" дзённай формы навучання. Падрыхтоўка кадраў па гэтай спецыяльнасці пры завочнай форме праводзілася на ўлікова-фінансавым факультэце.***

Пасля рэарганізацыі ў 1992 годзе інстытута ў Эканамічны універсітэт пры факультэце арганізавана стацыянарная і завочная форма падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасці "Фінансы і крэдыт" са спецыялізацыяй "Фінансы", "Фінансы і крэдыт ў знешнеэканамічнай дзейнасці" і "Страхаванне".

Падрыхтоўку кадраў здзяйсняюць высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія маюць шматгадовы вопыт работы, бясспрэчнае педагагічнае майстэрства. Гэта з поўным правам можна аднесці да такіх выкладчыкаў, як прафесары М.І. Ткачук, М.Е. Заяц, М.К. Фісенка, А.В. Шашкоўскі, В.І. Галубовіч, Т.І. Васілеўская, дацэнты Т.І. Вуколава, А.Г. Пекун, Г.К. Мультан, А.Ф. Кірэева, М.А. Зайцава, В.С. Бас, А.Г. Ціткін, Ю.Л. Грузіцкі, Г.П. Бушчык і многія іншыя.

За 1964—1997 гады на факультэце падрыхтавана больш 5 тысяч фінансістаў-эканамістаў, якія паспяхова працуюць у фінансавых органах рэспублікі, у банках, падатковых службах, на прадпрыемствах і г.д. Многія выпускнікі факультэта займалі або займаюць адказныя пасады ў вышэйшых органах кіравання рэспублікі, працуюць на пасадах намеснікаў міністраў, начальнікаў фінансавых упраўленняў, узначальваюць банкі. Выпускнік факультэта М.Е. Заяц — прарэктар нашага універсітэта, доктар эканамічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі навук, загадчык кафедры фінансаў. Большасць кіраўнікоў, пачынаючы ад раённых фінансавых аддзелаў да ўпраўленняў Міністэрства фінансаў, таксама былыя выпускнікі нашага факультэта. Амаль усе выкладчыкі кафедры фінансаў (асноўная звяна факультэта) заканчвалі фінансава-эканамічны факультэт. Большасць з іх маюць вучоныя званні дацэнтаў.

Калектыў факультэта выконвае значны аб'ём навуковых даследванняў. Практычна кожны год друкуюцца вынікі навуковых работ выкладчыкаў факультэта, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, метадычныя распрацоўкі. Плён даследванняў выкладчыкаў знаходзіць адлюстраванне ў выступленнях на навуковых канферэнцыях, семінарах, сімпозіумах, у тым ліку і на міжнародным узроўні. Да навуковай працы далучаюцца і студэнты. Штогод на універсітэцкі і рэспубліканскі агляды-конкурсы прадстаўляюцца 20—25 навуковых работ студэнтаў, многія з якіх адзначаюцца дыпломамі.

На працягу многіх гадоў калектыў кафедры фінансаў аналізуе дзеючы фінансавы механізм рэспублікі, уносіць свае прапановы па яго ўдасканальванню з улікам вопыту іншых краін, канкрэтнага эканамічнага становішча ў Беларусі, прымае ўдзел у распрацоўцы законадаўчых дакументаў па падаткаабкладанню.

## Факультэт права

***Заснаваны ён на базе самай буйной у рэспубліцы гаспадарча-прававой кафедры, якая дзейнічае ва універсітэце с 1953 года. Выпускнікі гэтага факультэта атрымліваюць спецыяльнасць "Правазнаўства" і кваліфікацыю юрыст з выдачай дыплому дзяржаўнага ўзору.***

***Падрыхтоўка на факультэце арганізавана па дзвух спецыялізацыях — "Прававое забеспячэнне знешнеэканамічнай дзейнасці" і "Гаспадарча-прававой".***

Вучэбнымі праграмамі прадугледжана навучанне юрыстаў не толькі прававым дысцыплінам, але і базавым ведам у галіне эканомікі. Таму нашы спецыялісты будуць спалучаць прававую і эканамічную адукацыю: яны здольны самастойна прааналізаваць стан прадпрыемства, скласці бізнес-план яго развіцця, вырашаць пытанні гаспадарчай дзейнасці, спрэчкі і канфлікты, могуць прымаць адказныя рашэнні кіраўніцкага характару.

На факультэце працуе зараз каля 80 выкладчыкаў, у тым ліку 3 доктары юрыдычных навук, 3 прафесары, 8 кандыдатаў юрыдычных навук, дацэнтаў, спецыялісты з дзяржаўных і камерцыйных структур.

За апошні час кафедрай правазнаўства выдадзены вучэбныя дапаможнікі па грамадзянскаму праву, міжнароднаму прыватнаму праву, прававому рэгуляванню знешнеэканамічнай дзейнасці і іншыя, якія на сёння з'яўляюцца самымі актуальнымі ў рэспубліцы.

Пры факультэце дзейнічае метадычны кабінет, які мае даволі вялікі збор навуковай, практычнай і вучэбнай літаратуры, а таксама банк заканадаўства на базе ПЭВМ, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе.

## Факультэт банкаўскай справы

***Зараз многія цікавяцца спецыяльнасцю "Фінансы і крэдыт", жадаючы знайсці сябе менавіта ў галіне банкаўскай справы. Сапраўды, у кадравым забеспячэнні банкаў асноўнае месца займае сістэма вышэйшай эканамічнай адукацыі.***

***Факультэт банкаўскай справы як самастойны працуе з 1992 года. Ён выкарыстоўвае багаты сучасны вопыт падрыхтоўкі кваліфікаваных эканамістаў для банкаў. Дастаткова адзначыць тое, што большасць банкаў Рэспублікі Беларусь узначальваюць нашы выпускнікі.***



Стварэнне самастойнага факультэта банкаўскай справы падкрэслівае ўзрослую значнасць падрыхтоўкі спецыялістаў гэтага профілю. Банкаўская справа прэстыжная ва ўсім свеце. Прэстыжная стала яна і ў нас. Асабліва ў перыяд пераходу да рынкавай эканомікі, калі банкі становяцца сапраўднымі камерцыйнымі структурамі, калі пашыраюцца віды банкаўскіх паслуг, калі кампетэнтным ў пытаннях бізнесу спецыялістам ёсць магчымасць рэалізаваць свае здольнасці.

Банкі заўсёды маюць патрэбу ў папаўненні спецыялістамі, але ў дадзены момант прад'яўляюцца да іх новыя патрабаванні — валоданне банкаўскімі тэхналогіямі, якія арыентаваны на сусветныя стандарты, веданне замежных моў, вопыт работы.

Выпускнікі факультэта па спецыяльнасці "Фінансы і крэдыт", "Улік, аналіз і аўдыт у банках" падрыхтаваны да эканамічнай, арганізацыйна-кіраўніцкай, уліковай, аналітычнай і даследчай дзейнасці пераважна ў банках і іншых фінансавых і крэдытных установах, арганізацыях.

У працэсе навучання яны атрымліваюць дастатковыя веды агульнатэарэтычнага цыклу (эканамічная тэорыя, статыстыка, бухгалтарскі ўлік, аналіз гаспадарчай дзейнасці, маркетынг і інш.). Паглыблена вывучаюць дысцыпліны, якія раскрываюць сутнасць грашовых адносінаў, дзяржаўныя фінансы, фінансы прадпрыемстваў, аперацыі банкаў, выкарыстанне ЭВМ у банкаўскай практыцы. Вытворчая практыка, выкананне і абарона дыпломнай работы даюць навыкі самастойнага прыняцця рашэнняў па пытаннях, якія звязаны з арганізацыяй фінансавай і крэдытнай работы, банкаўскага ўліку.

Заняткі на факультэце праводзяцца вопытнымі педагогамі, у тым ліку запрошанымі ва універсітэт замежнымі спецыялістамі. Шэраг лекцыйных курсаў чытаецца высокакваліфікаванымі спецыялістамі-практыкамі — работнікамі Нацыянальнага і вядучых камерцыйных банкаў рэспублікі, якія паспяхова спалучаюць навукова-педагагічную дзейнасць з практычнай работай. Гэта садзейнічае павышэнню інфармацыйнай насычанасці заняткаў, дапамагае хутчэй засвойваць новыя банкаўскія тэхналогіі, даведвацца аб перспектывах развіцця банкаўскай сістэмы.

Для паляпшэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, набыцця навыкаў практычнай дзейнасці на базе філіяла АСБ "Беларусбанк", размешчанага ў будынку ВНУ, абсталяваны вучэбны клас, дзе студэнты маюць магчымасць азнаёміцца з умовамі працы па спецыяльнасцях, якія яны атрымліваюць, непасрэдна на рабочых месцах.

Вялікая ўвага на факультэце надаецца навукова-даследчай рабоце. У рамках студэнцкага навуковага таварыства функцыянуюць навуковыя гурткі. Кіруюць даследчай дзейнасцю студэнтаў вопытныя настаўнікі з ліку вядучых спецыялістаў банкаўскай навукі. Вынікі сваёй навуковай работы студэнты маюць магчымасць давесці да шырокіх колаў на канферэнцыях, праз друкаваныя выданні, у тым ліку і за мяжой.

Малады персанал у банках, як правіла, паспяхова выкарыстоўвае сучасныя метады вядзення банкаўскіх аперацый, хутчэй авалодвае новымі відамі паслуг і прапаноўвае іх сваім кліентам. Выпускнікі ВНУ, якія добра валодаюць замежнымі мовамі, маюць магчымасць прайсці стажыроўку за мяжой.

**На здымку: вядучы эканаміст АСБ "Беларусбанк" К.А.Варанько дае кансультацыі па рабоце з кліентамі студэнткам 4 курса ФБС М.Бязверхай і М.Гусявай.**

*Фота М.Лявонава.*

# і спецыяльнасці

***Атрымаць сучасную, вельмі прэстыжную і запатрабаваную практыкай спецыяльнасць, з якой вы зоймеце ключавыя месцы ў рынчанай эканоміцы, запрашае***

## Факультэт маркетынгу

Выпускнікі факультэта здольны распрацоўваць стратэгію развіцця прадпрыемстваў, вызначаць іх будучыню. Ад пасяховай работы спецыялістаў па маркетынгу залежыць фінансавы вынік прадпрыемства і дабрабыт калектыву. Яны могуць прагназаваць аб'ёмы збыту прадукцыі і паслуг, даць адказ на пытанне, ці мае сэнс вытворчасць тых ці іншых тавараў.

Калі вы хочаце добра авалодаць тэорыяй маркетынгу, яго прынцыпамі, займацца практыкай маркетынгу ў розных галінах эканомікі, дык паступайце на наш факультэт на ***спецыяльнасць "Маркетынг"***. Эканамісты-менеджэры па маркетынгу патрэбны кожнаму прадпрыемству, асабліва вялікім, на якіх маюцца спецыялізаваныя службы маркетынгу. Вельмі цікавая праца чакае іх у самастойных маркетынгавых фірмах, якія аказваюць паслугі розным прадпрыемствам па вывучэнню попыту на тавары, распрацоўцы рэкламных кампаній, арганізацыі выстаў, ярмарак і г.д. Праца спецыяліста па маркетынгу вызначаецца творчым характарам, таму мы чакаем дапытлівую, працавітую моладзь з нестандартным мысленнем, якая мае схільнасць да навуковых даследаванняў.

Акрамя спецыялістаў шырокага профілю на факультэце вядзецца падрыхтоўка кадраў яшчэ па дзвюх ***спецыялізацыях: "Кіраванне забеспячэннем і збытам" і "Цэнаўтварэнне"***.

Студэнты, якія зрабілі свой выбар на карысць спецыялізацыі "Кіраванне забеспячэннем і збытам" атрымліваюць грунтоўную падрыхтоўку ў галіне прамысловага маркетынгу, лагістыкі, гандлю сродкамі вытворчасці, рэкламы, сервіса, тавараруху і інш. Па заканчэнні факультэта яны змогуць працаваць у службах маркетынгу, збыту і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння прамысловых прадпрыемстваў. Акрамя гэтага, месцамі іх працы з'яўляюцца аптовыя фірмы, таварна-сыравінныя біржы, брокерскія канторы, фірменныя магазіны, рэкламныя агенцтвы, складскія комплексы, знешнегандлёвыя арганізацыі, гандлёвыя дамы.

Адной з вельмі значных функцый маркетынгу з'яўляецца распрацоўка цэнавай палітыкі прадпрыемства. З гэтай задачай пасяхова будуць спраўляцца выпускнікі факультэта, атрымаўшыя спецыялізацыю "Цэнаўтварэнне".

Вучэбны план па гэтай спецыялізацыі дазваляе атрымаць добрую падрыхтоўку па маркетынгу, а таксама больш дэталёвыя веды па цэнах і цэнавай палітыцы. Спецыялісты па цэнах і цэнавай палітыцы змогуць працаваць у службах маркетынгу і эканамічных падраздзяленнях прадпрыемстваў, а таксама ў цэнтральных і мясцовых органах цэнаўтварэння і кантролю за цэнамі.

На факультэце існуюць як дзённая, так і завочная формы навучання.



Студэнты факультэта рыхтуюцца да практычных заняткаў у вучэбнай бухгалтэрыі.

*Фота М.Лявонава.*

## Факультэт уліку і статыстыкі

***На факультэце вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасцях "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт у прамысловасці", "Улік, аналіз і аўдыт у будаўніцтве", "Улік, аналіз і аўдыт у бюджэтных і навуковых установах" і "Статыстыка".***

Выпускнікі факультэта павінны валодаць неабходнымі ведамі ў галіне эканамічнай тэорыі, кіравання народнай гаспадаркай ва ўмовах рыначнай эканомікі, па бухгалтарскаму ўліку, аўдыту, падаткаабкладанню, аналізу гаспадарчай дзейнасці, фінансам прадпрыемстваў, статыстыцы. А таксама ведаць прававыя асновы прадпрымальніцтва і камерцыі, эканамічныя асновы камерцыйнай дзейнасці, тэорыю грошаў, крэдыту і фінансаў, рынак каштоўных папер, маркетынг і менеджмент, эканамічную інфарматыку і камп'ютэрныя сістэмы.

Выпускнікі спецыяльнасці ***"Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт"*** могуць працаваць галоўнымі бухгалтарамі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў усіх форм уласнасці, начальнікамі фінансавых і падатковых органаў, эканамістамі, аўдытарамі дзяржаўных кантрольных органаў.

Эканаміст па статыстыцы можа займаць пасады эканаміста ў органах дзяржаўнай статыстыкі, міністэрствах, ведамствах, на буйных прадпрыемствах, вылічальных цэнтрах, навуковага і малодшага навуковага супрацоўніка ў навукова-даследчых установах, асістэнта або лабаранта ў вучэбных установах.

Эканаміст па статыстыцы ў ступені магістра пры наяўнасці адпаведнага стажу працы можа займаць пасады галоўных альбо вядучых спецыялістаў, начальнікаў упраўленняў, аддзелаў, сектараў.

Прафілюючыя кафедры факультэта маюць камп'ютэрныя класы, дзе праводзяцца заняткі па бухгалтарскаму ўліку, аналізу і аўдыту і эканамічнаму аналізу гаспадарчай дзейнасці, статыстыцы і іншых дысцыплінах з выкарыстаннем першасных дакументаў, уліковых рэгістраў у камп'ютэрным асяроддзі.

Студэнты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце, мастацкай самадзейнасці, спартыўных мерапрыемствах універсітэта.

Прафесарска-выкладчыцкі склад ФУС непасрэдна ўдзельнічае ў распрацоўцы нарматыўных палажэнняў па эканамічных пытаннях Рэспублікі Беларусь.

## Факультэт менеджменту

***Сярод работнікаў важнейшых галін народнай гаспадаркі значнае месца займаюць эканамісты-менеджэры. Кола іх службовых абавязкаў вельмі шырокае.***

Рыначныя адносіны абумоўліваюць карэнныя змены ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Напрыклад, спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве аграпрамысловага комплексу", "Дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне", "Эканамічная кібернетыка" (аптымізацыя сістэмы планавання і кіравання ў эканоміцы) абумоўліваюць глыбокія веды па эканоміцы, арганізацыі і тэхналогіі кіравання вытворчасцю.

Студэнты, выбраўшыя спецыяльнасць гэтага факультэта, будуць вывучаць механізм дзейнасці рынку, эканоміка-матэматычныя метады, эканоміка-вылічальную тэхніку, эканамічны аналіз, улік і кантроль, фінансы, камерцыйную, маркетынгавую, прадпрымальніцкую і знешнеэканамічную дзейнасць прадпрыемстваў.

Студэнты вывучаюць багацейшы сусветны вопыт сістэмы кіравання рэсурсамі ва ўмовах цывілізаванай канкурэнцыі.

Што датычыць аграрнага сектара рэспублікі, то ў ім адбываюцца сур'ёзныя пераўтварэнні, звязаныя са зменненнем адносінаў уласнасці, развіццём розных формаў арганізацыі вытворчасці, пачынаючы ад сялянскіх і фермерскіх гаспадарак і заканчваючы буйнымі інтэгрыраванымі агрфірмамі, агракамбінатамі і г.д. Адначасова змяняецца механізм арганізацыі і кіравання дзейнасцю калгасаў і саўгасаў.

Аграрны сектар чакае маладых прафесіянальна падрыхтаваных эканамістаў і кіраўнікоў, якія павінны дасканала валодаць эканамічным і арганізацыйна-кіраўніцкім механізмам дзейнасці новых аграрных форм.

Неабходныя для гэтага веды можна атрымаць, выбраўшы спецыялізацыю ***"Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве аграпрамысловага комплексу"***. Па гэтай спецыялізацыі вас навучаць асновам тэхналогіі вытворчасці і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, выяўленню рэзерваў і галоўных напрамкаў развіцця вытворчасці, пошуку шляхоў рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў, выгадных каналаў рэалізацыі прадукцыі.

***"Дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне"*** з'яўляецца адной з найбольш складаных, своеасаблівых і цікавых прафесій. Спецыяліст гэтага напрамку павінен быць падрыхтаваны да аналітычнай, арганізацыйна-кіраўніцкай і практычнай дзейнасці на ўсіх узроўнях кіравання. Ён павінен умець распрацоўваць праграмы і прагнозы сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі, рэгіёнаў і вышэйшых сфер дзейнасці, умець рэгуляваць працэсы раздзяржаўлення і прыватызацыі дзяржаўнай і муніцыпальнай маёмасці, умець ствараць умовы для фарміравання рыначных адносінаў у рэспубліцы, рэгіёне.

Месцы іх працы: Міністэрства эканомікі, дэпартамент цэн, іншыя дзяржаўныя ўстановы, аддзелы кіравання аблвыканкамаў, гарвыканкамаў, райвыканкамаў і іншых тэрытарыяльных органаў кіравання.

***"Эканамічная кібернетыка"*** — сучасная, не менш цікавая і прэстыжная прафесія. Спецыяліст гэтага напрамку павінен быць падрыхтаваны да аналітычнай, арганізацыйна-кіраўніцкай і практычнай дзейнасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі: на прадпрыемствах з рознымі формамі ўласнасці, у кааператывах, у навучальных і навукова-даследчых інстытутах, у органах кіравання народнай гаспадаркай, у сістэме фінансаў і г.д.

Ён павінен валодаць ведамі ў галіне прымянення вылічальнай тэхнікі і кіраўніцкай дзейнасці, у распрацоўцы і стварэнні аўтаматызаваных сістэм кіравання, эксплуатацыі аўтаматызаваных рабочых месцаў. Гэты спецыяліст таксама павінен валодаць метадалогіяй сістэмнага аналізу і прагназавання, развіцця рынку тавараў, прадукцыйнасці працы, інфраструктуры, эканамічных сувязей.

## Уліково-эканамічны факультэт

***У працэсе сваёй дзейнасці кожнае прадпрыемства, арганізацыя, установа выкарыстоўваюць розныя віды сродкаў і прадметаў працы, праводзяць грашовыя разлікі з працаўнікамі за выробленую прадукцыю, за розныя паслугі. Грамадству, працоўнаму калектыву і кожнаму работніку неабыякава: што і ў якіх памерах трэба вырабляць, якія выдаткі для гэтага неабходны, якая эфектыўнасць вытворчасці і якія вынікі працы. Усё гэта і абумоўлівае неабходнасць вядзення гаспадарчага ўліку. З дапамогай ўліку здзяйсняецца падрыхтоўка інфармацыі для выканання розных функцый кіравання. Ён адыгрывае важную ролю ва ўмацаванні гаспадарчага разліку, з'яўляецца сродкам кантролю за захаваннем матэрыяльных, працоўных і грашовых рэсурсаў.***

***У наш час праяўляецца асаблівая цікавасць да пытанняў бухгалтарскага ўліку. Гэта выклікана шэрагам прычын, але важнейшая з іх абумоўлена пераходам рэспублікі да рынкавай эканомікі. У новых умовах бухгалтарскі ўлік далёка выходзіць за рамкі рахункаводства — ранейшай рэгістрацыі гаспадарчых аперацый. Усе, хто ўцягнуты ў дзелавое жыццё, павінны ўмець карыстацца тэрмінамі і паняццямі бухгалтарскага ўліку, свабодна чытаць бухгалтарскія і фінансавыя дакументы.***

***Бухгалтарскі ўлік — гэта мова бізнесу і прадпрымальнікі павінны валодаць ёй. Бухгалтар становіцца не толькі адной з прэстыжных, але і сучасных, патрэбных прафесій. Ад кваліфікацыі бухгалтара ў многім залежыць фінансавы поспех прадпрыемства. Сучасны бухгалтар заняты не толькі ўліковымі запісамі, у кола яго дзейнасці ўключаны планаванне і рашэнне праблем, кантроль і кіраванне, ацэнка, праверка, аўдыт. Адной з важнейшых задач уліку ва ўмовах рынкавай эканомікі з'яўляецца фарміраванне інфармацыі, неабходнай для прагназіравання цэн.***

***Пераход да рынку паставіў праблему карэннага змянення падыходаў і падрыхтоўкі бухгалтарскіх кадраў, якія б адпавядалі сучаснай эканоміцы.***

Факультэт ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў па ўліку па спецыялізацыях ***"Улік, аналіз і аўдыт у гандлі", "Улік, аналіз і аўдыт у аграпрамысловым комплексе", "Улік, аналіз і аўдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці"***.

Спецыяліст вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт" павінен мець высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі, валодаць шырокай эрудыцыяй, умець прымяняць на практыцы прынцыпы навуковай арганізацыі працы, валодаць перадавымі метадамі кіравання эканомікай, ведаць асновы рынкавай эканомікі, арганізацыю ўліку ў развітых замежных краінах, аўдыт. Ён павінен умець арганізаваць і весці бухгалтарскі ўлік на прадпрыемствах, у арганізацыях і ўстановах усіх форм уласнасці з выкарыстаннем персанальных камп'ютэраў і іншых сучасных тэхнічных сродкаў.

Прафесія бухгалтара становіцца не толькі адной з прэстыжных, але і сучаснай, патрэбнай. Ад кваліфікацыі бухгалтара ў многім залежыць фінансавы поспех прадпрыемства.

Выпускнікі факультэта працуюць галоўнымі бухгалтарамі, іх намеснікамі, кіраўнікамі аддзелаў бухгалтэрый, бухгалтарамі, бухгалтарамі-фінансістамі, рэвізорамі, аўдытарамі на прадпрыемствах гандлёвых арганізацый, галін аграпрамысловага комплексу, у сумесных прадпрыемствах і іншых галінах народнай гаспадаркі ўсіх формаў уласнасці. Набытая агульнаадукацыйная прафесійная падрыхтоўка выпускнікоў факультэта дазваляе ім працаваць кіраўнікамі арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў у розных галінах вытворчасці.

# Факультэт эканомікі і кіравання гандлем

***ФЭКГ — адзін з самых старэйшых факультэтаў універсітэта, існуе з моманту яго заснавання і знаходзіцца ў самым першым будынку "наргаса" па вул. Свярдлова, 7.***

***У цяперашні час факультэт ажыццяўляе падрыхтоўку студэнтаў па спецыяльнасці "Камерцыйная дзейнасць на рынку тавараў і паслуг" па розных спецыялізацыях.***

Па спецыялізацыі "Камерцыйная дзейнасць на рынку тавараў народнага спажывання" арганізавана падрыхтоўка эканамістаў для гандлёвых прадпрыемстваў.

Вучэбныя планы па гэтай спецыялізацыі прадугледжваюць вывучэнне такіх дысцыплін, як эканоміка, улік, фінансы, банкаўская справа, маркетынг, менеджмент, цэнаўтварэнне, камерцыйная дзейнасць, гандлёвае права, таваразнаўства і іншыя.

На практыцы выпускнікі па гэтай спецыялізацыі могуць працаваць на самых разнастайных пасадах: кіраўнікамі, менеджэрамі, маркетолагамі, эканамістамі, бухгалтарамі прадпрыемстваў рознічнага і аптовага гандлю ўсіх формаў уласнасці. З задавальненнем іх прымаюць у банкаўскую сферу. Асноўнымі функцыямі гэтых спецыялістаў з'яўляецца кіраванне дзейнасцю прадпрыемства, аддзела, секцыі магазіна, эканамічны аналіз і прагноз асноўных паказчыкаў гандлёвай дзейнасці, арганіацыя сувязей з вытворчасцю, камерцыйнай дзейнасці і г.д.

Па ***спецыялізацыі "Камерцыйная дзейнасць на рынку паслуг"*** факультэт рыхтуе спецыялістаў для сістэмы грамадскага харчавання.

Выпускнікі гэтай спецыялізацыі могуць узначальваць рэстараны, кафэ, сталовыя і іншыя прадпрыемствы грамадскага харчавання, працаваць эканамістамі і менеджэрамі.

Акрамя пералічаных вышэй дысцыплін студэнты дадаткова вывучаюць тэхналогію прыгатавання ежы, знаёмяцца з ёю на практыцы, паглыблена вывучаюць таваразнаўства харчовых тавараў. Выпускнікам таксама прысвайваецца кваліфікацыя эканаміст.

Па ***спецыялізацыі "Камерцыйная дзейнасць на знешнім рынку"*** факультэт рыхтуе эканамістаў для знешняга гандлю. Студэнты гэтай спецыялізацыі паглыблена вывучаюць такія дысцыпліны, як міжнародныя эканамічныя і дыпламатычныя адносіны, міжнароднае гандлёвае права, камерцыйная дзейнасць у міжнародным гандлі, эканоміка і арганізацыя знешняга гандлю, замежная мова і г.д.

Выпускнікі гэтай спецыялізацыі могуць працаваць у знешнегандлёвых арганізацыях і прадпрыемствах, мытным камітэце, гандлёвых прадстаўніцтвах Рэспублікі Беларусь за мяжой, арганізаваць знешнегандлёвую дзейнасць ва ўсіх гандлёвых органах і прадпрыемствах дзяржаўнага, кааператыўнага і прыватнага гандлю, а таксама прамысловасці і нават сельскай гаспадаркі, ажыццяўляючых знешнегандлёвыя камерцыйныя аперацыі.

Паспяхова займацца камерцыйнай дзейнасцю можа спецыяліст гандлю, які добра ведае тэхналогію вытворчасці, якасць і канкурэнтаздольнасць тавараў. Такімі спецыялістамі з'яўляюцца таваразнаўцы, якія атрымалі паглыбленыя веды ў вобласці тэхналогіі вырабу тавараў, іх асартыменту і якасці, арганізацыі і кіравання, маркетынгу і г.д. ***па спецыялізацыях "Камерцыйная дзейнасць і таваразнаўства харчовых тавараў" і "Камерцыйная дзейнасць і таваразнаўства нехарчовых тавараў".***

Працуюць выпускнікі таваразнаўцамі-камерсантамі, таваразнаўцамі-брокерамі, таваразнаўцамі-экспертамі, загадчыкамі (намеснікамі) аддзелаў, секцый магазінаў, складаў, начальнікамі і намеснікамі камерцыйных, тварных, гандлёвых аддзелаў прадпрыемстваў.

***Адзін з найноўшых факультэтаў універсітэта —***

# Вышэйшая школа турызму

Стварэнне Вышэйшай школы турызму абумоўлена актыўным развіццём у апошнія гады турыстычнага бізнесу ў нашай рэспубліцы.

Па прагнозах міжнародных экспертаў да 2000 году турызм, як галіна, павінен выйсці па прыбытках на 1-е месца ў свеце. Для таго, каб гэта стала рэальным і ў маштабах Беларусі, турызмам павінны займацца адукаваныя, эканамічна высокакваліфікаваныя спецыялісты, якіх дагэтуль не рыхтавала ні адна ВНУ. Улічваючы змяненні і становішча на рынку турыстычных паслуг, ва універсітэце на факультэце "Вышэйшая школа турызму" і вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў у гэтым напрамку.

У рамках факультэта ажыццяўляецца падрыхтоўка эканамістаў-менеджэраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці — ***"Эканоміка і кіраванне сацыяльна-культурнай сферай" са спецыялізацыямі "Эканоміка і кіраванне турызмам" і "Эканоміка і кіраванне гасцінічнай і рэстараннай гаспадаркай".***

У працэсе навучання студэнты атрымліваюць трывалыя веды па спецыяльных дысцыплінах. Больш паглыблена вывучаюцца спецыялізаваныя дысцыпліны, якія раскрываюць сутнасць турыстычнага бізнесу. Значная ўвага надаецца моўнай падрыхтоўцы студэнтаў. Пэўныя магчымасці ў гэтым накірунку ёсць ва ўсталяванні сувязей з аналагічнымі ВНУ замежных краін.

Выпускнікі ВШТ маюць магчымасць працаваць на кіруючых пасадах рознага ўзроўню ў турыстычных прадпрыемствах, гасцініцах, рэстаранах і органах дзяржаўнага кіравання; у якасці прадпрымальнікаў, якія займаюцца турбізнесам, гасцінічнай ці рэстараннай справай; выкладчыкамі турысцкіх ліцэяў, каледжаў, ВНУ, НДІ; афіцыйнымі прадстаўнікамі інтарэсаў РБ у галіне міжнароднага турызму.

Турыстычны бізнес і спецыялісты гэтай галіны маюць прэстыж ва ўсім свеце. Факультэт "Вышэйшая школа турызму" — унікальная магчымасць атрымаць вышэйшую эканоміка-упраўленчую адукацыю.



**На здымку: у адным з лінгафонных класаў універсітэта.**

***Фота М.Лявонава.***

# Факультэт падрыхтоўкі ва універсітэт

***У адзінай сістэме бесперапыннай, інтэгрыраванай, шматузроўневай адукацыі важным звяном з'яўляецца падрыхтоўка да паступлення ў ВНУ і прафарыентацыя моладзі.***

***Непасрэдны ўдзел нашага універсітэта ў адборы будучых спецыялістаў яшчэ на ступені школы з'яўляецца важнай умовай не толькі іх прафесійнай арыентацыі, але, у першую чаргу, якаснай падрыхтоўкі да магчымага навучання ў вышэйшай школе.***

Асноўнымі задачамі факультэта з'яўляюцца данавучанне, паўторнае і паралельнае навучанне, аднаўленне і замацаванне ведаў, паглыбленая і пашыраная адукацыя і самаадукацыя і персаналізацыя вучэбнага працэсу, аб'яднанне на адзінай навукова-метадычнай аснове існуючых і новых прагрэсіўных формаў падрыхтоўкі ў ВНУ.

У структуры факультэта прадугледжана функцыяніраванне падрыхтоўчага аддзялення, падрыхтоўчых курсаў, эканамічных класаў на базе гімназій і базавых школ рэспублікі.

На падрыхтоўчае аддзяленне па выніках субяседавання прымаюцца асобы, якія працуюць па профілі абранай спецыяльнасці, ваеннаслужачыя, звольненыя ў запас.

Субяседаванне праводзіцца па дысцыплінах уступных экзаменаў ва універсітэт.

Вучоба на падрыхтоўчым аддзяленні платная. Грашовы ўзнос могуць унесці прадпрыемствы, арганізацыі альбо самі паступаючыя.

У адпаведнасці з Заканадаўствам і Правіламі прыёму асобныя слухачы аддзялення карыстаюцца льготамі пры залічэнні і плаце за вучобу.

Паступаючыя падаюць заяву на імя рэктара, накіраванне на падрыхтоўчае аддзяленне вызначанай формы (для асоб, якія будуць вычыцца за кошт прадпрыемстваў), дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), копію працоўнай кніжкі, 6 чорна-белых фотакартак памерам 3 х 4, медыцынскую даведку па форме 086/У. Пашпарт і іншыя дакументы паступаючыя прад'яўляюць асабіста.

Заявы прымаюцца з 24 жніўня па 25 верасня. Субяседаванне праводзіцца па дысцыплінах уступных экзаменаў ва універсітэт з 27 верасня па 2 кастрычніка.

Па заканчэнні курса навучання слухачы здаюць выпускныя экзамены. Вытрымаўшыя іх без адзнак "3", "3,5" залічваюцца на першы курс без уступных экзаменаў. Слухачы, атрымаўшыя адзнакі "3", "3,5", удзельнічаюць у конкурсе на агульных падставах.

Навучанне на падрыхтоўчым аддзяленні ажыццяўляецца без адрыву ад вытворчасці. Выпускнікі залічваюцца ва універсітэт толькі на завочную форму навучання.

Мэтанакіраванае фарміраванне студэнцкага кантынгенту, павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў ажыццяўляецца таксама праз эканамічныя класы, якія існуюць на базе гімназій і базавых школ рэспублікі. Навучанне ў гэтых школах і класах вядзецца па паглыбленых навучальных планах і праграмах, зацверджаных Міністэрствам адукацыі; прадугледжана вывучэнне спецыяльных дысцыплін, якія складаюць універсітэцкі кампанент.

Асаблівая ўвага на падрыхтоўчых курсах звяртаецца на пераадольванне разрыву паміж узроўнем падрыхтоўкі ў сярэдняй школе і патрабаваннямі ВНУ, пашырэнне і паглыбленне ведаў найбольш здольных навучэнцаў. Гэта дасягаецца шматварыянтнасцю навучальных планаў і праграм па дысцыплінах уступных экзаменаў, колькасным і якасным падборам навучальных груп, выкарыстаннем арыгінальных методык і індывідуалізацыяй навучання. Падрыхтоўка слухачоў на курсах вядзецца па дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання (а таксама шляхам спалучэння гэтых формаў) з кастрычніка па ліпень.

Вучоба на ўсіх відах курсаў платная.

# Бобруйский филиал

| Шифр | Специализация | Всего (дневная форма) |
|---|---|---|
| Э.01.03.00 | Экономика и управление на предприятии промышленности | 15 |
| Э.01.07.01 | Учет, анализ и аудит в промышленности | 15 |

**Прием документов и вступительные экзамены от абитуриентов, поступающих на бюджетную форму обучения, проводится в приемной комиссии Белорусского государственного экономического университета в г. Минске.**

**На дневное и заочное обучение прием документов и собеседование с абитуриентами, поступающими сверх контрольных цифр приема (на платную форму обучения), осуществляется в Бобруйском филиале Белорусского государственного экономического университета по адресу: 213800, г. Бобруйск, ул. Советская, 77/48, БФ БГЭУ.**

# AIESEC

***Семь лет в нашем университете действует международная организация AIESEC. Эта независимая, неполитическая, некоммерческая организация, полностью управляемая студентами, учреждена в 1948 году и объединяет более 87000 студентов из 85 стран мира. Одна из этих стран — Беларусь.***

В Беларуси имеется два Локальных Комитета AIESECа — в Минске на базе БГЭУ и в Гродно на базе ГрГУ. Основная задача, которая стоит перед айсекерами, — повышение своего образовательного уровня, сокращение разрыва между теоретическими знаниями и практикой, приобретение практического опыта в различных областях экономики.

С этой целью проводятся тематические программы, осуществляется международная программа стажировок, а также маркетинг, который включает в себя маркетинговые исследования, информационно-рекламное обеспечение бизнеса, организацию мероприятий прямого маркетинга, организацию мероприятий паблик рилейшнз. Причем вовсе необязательно вам все это уметь и знать. Вас этому здесь научат и дадут проявить себя.

Еще одним примером деятельности AIESECа являются ставшие уже традиционными "Дни карьеры". Цель их проведения — помощь в решении кадровых вопросов компаний, нуждающихся в высококвалифицированных молодых специалистах. Программа также позволяет решить проблему занятости для молодых людей, обладающих определенными знаниями и личными качествами.

Активно AIESEC занимается проектом, связанным с Internet и тесно сотрудничает с компанией Tishkoff Publisher Inc. Принять участие в осуществлении этих проектов может любой заинтересованный в этом студент, лишь бы было желание и чувство ответственности за порученное дело.

# Парадак здачы ўступных экзаменаў

### Агульныя палажэнні

1. Усе абітурыенты на здачу экзаменаў выклікаюцца паведамленнем.

2. Уступныя экзамены і кансультацыі праводзяцца па раскладзе, зацверджаным рэктарам. Прозвішчы экзаменатараў у раскладзе не ўказваюцца. Яны вызначаюцца старшынёй прыёмнай камісіі перад самым пачаткам экзаменаў.

3. Уступныя экзамены праводзяцца па экзаменацыйных білетах і заданнях, якія складаюцца старшынямі экзаменацыйных камісій у адпаведнасці з праграмамі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі, падпісваюцца імі і зацвярджаюцца старшынёй прыёмнай камісіі.

4. Пры правядзенні пісьмовага экзамену варыянт задання вызначаецца жараб'ёўкай з удзелам абітурыентаў у адной з аўдыторый, дзе праводзіцца пісьмовы экзамен, вуснага — кожным абітурыентам (па білетах).

5. Прысутнасць на ўступных экзаменах пабочных асоб без дазволу старшыні (намесніка) прыёмнай камісіі не дапускаецца.

6. Уваход у вучэбныя карпусы і аўдыторыі на экзамены дазваляецца пры наяўнасці экзаменацыйнага ліста і пашпарта.

7. На здачу пісьмовых экзаменаў адводзіцца чатыры астранамічныя гадзіны без перапынку, для падрыхтоўкі на вусным экзамене — не больш 1,5 гадзіны.

8. Старшыні экзаменацыйных камісій вызначаюць крытэрыі адзнакі па прадметах уступных экзаменаў і зацвярджаюць іх рашэннем прыёмнай камісіі. Крытэрыі даводзяцца да ведама абітурыентаў.

9. Пераздача ўступных экзаменаў не дазваляецца.

10. Абітурыенты, якія не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых экзаменаў не дапускаюцца.

11. Пры наяўнасці ўважлівых прычын, пацверджаных дакументамі, паступаючыя могуць дапускацца да здачы ўступных экзаменаў з дазволу намесніка старшыні прыёмнай камісіі ці адказнага сакратара ў межах вызначаных тэрмінаў правядзення экзаменаў.

12. Змест адказу абітурыент адлюстроўвае ў лістах вуснага адказу (па замежнай мове) альбо ў лістах-укладышах для выканання пісьмовай работы (па матэматыцы, беларускай (рускай) мове і літаратуры). Лісты вуснага адказу, бланкі тытульнага ліста з укладышамі для пісьмовай работы павінны мець штамп універсітэта і выдаюцца абітурыенту на экзамене.

13. Выдача экзаменацыйных лістоў і абвяшчэнне адзнакі па пісьмовым экзамене ажыццяўляецца на наступны дзень. Пры атрыманні нездавальняючай адзнакі экзаменацыйныя лісты не выдаюцца.

14. Кожны паступаючы мае права асабіста азнаёміцца са сваёй пісьмовай работай незалежна ад атрыманай адзнакі.

### Экзамен па матэматыцы

1. На экзамене па матэматыцы кожны абітурыент атрымлівае свой варыянт задання, у якім сем задач і прыкладаў. У ім адсутнічаюць тэарэтычныя пытанні (доказы тэарэм, вывад формул і г.д.). Але ж веданне матэматычных палажэнняў, тэарэм, формул, навыкі правядзення тоесных пераўтварэнняў, уменне коратка і выразна выкладаць сэнс матэматычных разважанняў у пісьмовай форме — гэта тое, што абітурыент абавязаны паказаць у сваёй рабоце.

Пералік пытанняў, асноўныя матэматычныя паняцці, факты, формулы і тэарэмы выкладаюцца у праграме па матэматыцы для паступаючых у ВНУ. Пры гэтым неабходна адзначыць, што можна рашаць прапануемыя прыклады і задачы любымі вядомымі абітурыенту матэматычнымі метадамі (дазваляецца прымяняць метады, якія не прадугледжаны школьнай праграмай).

2. Пасля выканання задання кожны абітурыент перадае экзаменатару выкананую пісьмовую работу (уключаючы і чарнавік) разам з тытульным і экзаменацыйным лістамі.

3. У пісьмовых экзаменацыйных работах па матэматыцы (у тым ліку і чарнавіку) недапушчальныя ніякія пабочныя пазначэнні і запісы.

4. Экзаменацыйныя работы правяраюцца пад шыфрам без указання прозвішча паступаючага. Шыфроўку праводзіць адказны сакратар прыёмнай камісіі або яго намеснік у прысутнасці аднаго з кіраўнікоў прыёмнай камісіі.

5. Пасля шыфроўкі тытульныя і экзаменацыйныя лісты захоўваюцца ў сейфе адказнага сакратара, а лісты-ўкладышы і экзаменацыйныя ведамасці з шыфрамі вяртаюцца старшыні экзаменацыйнай камісіі, які размяркоўвае паміж членамі экзаменацыйнай камісіі работы для праверкі.

6. Праверка пісьмовых работ праводзіцца толькі ў памяшканні універсітэта і толькі членамі экзаменацыйнай камісіі. Пры гэтым старшыня экзаменацыйнай камісіі абавязкова правярае работы, якія ацэнены на "2" (два) і "5" (пяць), а таксама выбарачна 5 % астатніх работ, правераных кожным экзаменатарам, і правільнасць адзнакі зацвярджае сваім подпісам.

7. Правераныя работы, а таксама запоўненыя экзаменацыйныя ведамасці з шыфрамі, адзнакамі і подпісамі правяраўшых экзаменатараў перадаюцца старшынёй экзаменацыйнай камісіі адказнаму сакратару або яго намесніку, якія праводзяць расшыфроўку работ і ўпісваюць прозвішчы паступаючых у экзаменацыйную ведамасць. Пасля гэтага ведамасці і экзаменацыйныя лісты перадаюцца старшыні экзаменацыйнай камісіі, які арганізуе ўпісванне адзнакі з ведамасці ў экзаменацыйны ліст абітурыента.

### Экзамен па беларускай (рускай) мове і літаратуры

1. Комплексны пісьмовы экзамен па мове і літаратуры праводзіцца ў выглядзе сачынення на адну з трох прапанаваных тэм літаратурнага, а таксама грамадска-палітычнага ці маральна-этычнага характару (па выбары абітурыента) па тых творах, якія яны вывучалі ў сярэдніх навучальных установах.

2. За сачыненне выстаўляецца адна адзнака, у якой ўлічваюцца веданне тэкстаў мастацкіх твораў, шырыня светапогляду абітурыента, багацце мовы і колькасць памылак, уменне аналізаваць, самастойна разважаць па пастаўленых праблемах, выказваць свае думкі лагічна, паслядоўна, зразумела і граматна, рабіць абагульненні і вывады.

3. Паступаючым забараняецца выкарыстоўваць у час экзамену тэксты твораў мастацкай літаратуры, даведнікі, слоўнікі і іншыя дапаможнікі. Спроба выкарыстаць гэты матэрыял заканчваецца выстаўленнем у экзаменацыйную ведамасць і экзаменацыйны ліст абітурыента адзнакі "2" (два). Рашэнне аб гэтым прымае старшыня экзаменацыйнай камісіі.

4. Прыкладны аб'ём сачынення 5—6 старонак вучнёўскага сшытка. Аднак якасць сачынення ацэньваецца не па колькасці старонак, а па глыбіні і паўнаце раскрыцця тэмы і граматнасці.

5. Адзнака па сачыненні выстаўляецца зыходзячы з прыкладных нормаў ацэнкі пісьмовых работ выпускнікоў сярэдніх агульнаадукацыйных школ.

6. Парадак апрацоўкі экзаменацыйных матэрыялаў па беларускай (рускай) мове і літаратуры такі, як па матэматыцы.

### Экзамен па замежнай мове

1. На экзамене па замежнай мове паступаючыя на спецыялізацыі, звязаныя са знешнеэканамічнай дзейнасцю, турызмам, павінны:

1.1. Зразумець змест урыўка мастацкага, грамадска-палітычнага або навукова-папулярнага тэксту аб'ёмам 3000 друкаваных знакаў. Прачытаць уголас і перакласці на беларускую ці рускую мову ў пісьмовым выглядзе акрэсленую экзаменатарам частку тэксту аб'ё-мам 900—1000 друкаваных знакаў. Адказаць на 8 пытанняў па змесце ўсяго тэксту і пераказаць на замежнай мове змест усяго тэксту. Карыстацца пры гэтым слоўнікам дазваляецца.

1.2. Пісьмова без слоўніка перакласці з роднай мовы на замежную 7 сказаў, якія змяшчаюць вывучаны лексічны і граматычны матэрыял.

1.3. Весці з экзаменатарам гутарку па адной з дваццаці вусных тэм, аб'ём маналагічнага выказвання пры гэтым павінен складаць не менш 12—15 сказаў. У выпадку дапушчэння абітурыентам памылак экзаменатар пісьмова робіць заўвагі ў лісце вуснага адказу.

Да паступаючых на ўсе астатнія спецыяльнасці і спецыялізацыі, не звязаныя са знешнеэканамічнай дзейнасцю і турызмам, прад'яўляюцца аналагічныя па форме і змесце патрабаванні, але па асобных раздзелах некалькі меншыя па аб'ёме. У прыватнасці, зразумець тэкст прапануецца аб'ёмам 1500 друкаваных знакаў, прачытаць уголас і перакласці на беларускую ці рускую мову ў пісьмовым выглядзе — 600 — 700 знакаў, адказаць на пытанні па змесце ўсяго тэксту, пісьмова без слоўніка перакласці з роднай мовы на замежную 4 сказы.

2. Экзамен у кожнага паступаючага прымаецца двума экзаменатарамі.

3. Адначасова ў аўдыторыі знаходзіцца не больш 5—6 чалавек, на адказ адводзіцца не больш 15 хвілін.

4. Пры падрыхтоўцы да экзамену абітурыент абавязкова робіць запісы ў лісце вуснага адказу, а экзаменатары адзначаюць правільнасць і паўнату адказаў на пытанні білета і дадатковыя пытанні, якія запісваюцца ў ліст вуснага адказу экзаменатарамі. Дадатковыя пытанні носяць удакладняючы характар і не выходзяць за межы праграмы.

5. Экзаменацыйная адзнака ставіцца лічбай і пропісам спачатку ў экзаменацыйную ведамасць, а потым у экзаменацыйны ліст паступаючага. Кожная адзнака па замежнай мове ў экзаменацыйнай ведамасці і ў экзаменацыйным лісце падпісваецца двума экзаменатарамі.

6. Экзаменацыйныя ведамасці і лісты вуснага адказу пасля заканчэння экзамену перадаюцца адказнаму сакратару (яго намесніку). Экзаменацыйныя лісты перадаюцца адказнаму сакратару (яго намесніку) ў выпадку, калі абітурыент атрымаў па замежнай мове нездавальняючую адзнаку альбо калі ўказаны экзамен быў апошнім.

***Прыёмная камісія.***

# Быт і адпачынак студэнтаў



***Цікавы адпачынак, добра арганізаваны быт студэнтаў у многім вызначаюць не толькі паспяховае асваенне імі вучэбнай праграмы, але і насычанае ўспрыманне навакольнага свету. Першачарговую ўвагу ў гэтым пытанні, як належыць, рэктарат і дэканаты імкнуцца ўдзяляць іншагароднім студэнтам, якія пражываюць у інтэрнатах.***

Дырэкцыя студэнцкага гарадка каардынуе дзейнасць усіх шасці інтэрнатаў універсітэта, у якіх жывуць тры з паловай тысячы іншагародніх студэнтаў дзённай формы навучання. У нашай ВНУ большасць іншагародніх студэнтаў пры жаданні забяспечваюцца месцамі ў інтэрнаце. Там маюцца таксама нумары гасцініцы для студэнтаў-завочнікаў, у якіх могуць пражываць бацькі, якія прыязджаюць наведаць сваіх дзяцей.

Ёсць у інтэрнатах і пакоі, дзе студэнты могуць рыхтавацца да заняткаў, актыўна адпачываць. Працуюць гурткі па інтарэсах, класы спартыўных трэнажораў, рытмічнай гімнастыкі.

Акрамя спецыяльнай гарадской студэнцкай паліклінікі № 33 юнакі і дзяўчаты, якія навучацца ва універсітэце, карыстаюцца разнастайнымі відамі медыцынскіх паслуг у санаторыі-прафілакторыі ВНУ (стацыянара і сезоннага тыпу), дзе ёсць лячэбныя кабінеты і водалячэбніца.

Вось ужо сем гадоў ў маляўнічых наваколлях Вілейскага вадасховішча дзейнічае прафілактычна-аздараўленчы маладзёжны летнік. Штогод там адпачываюць і папраўляюць сваё здароўе каля 500 чалавек.

Харчаванне студэнтаў забяспечваюць сталовыя ВНУ, буфеты ў інтэрнатах, дзе адначасова могуць сесці за абедзеныя сталы больш за 800 наведвальнікаў. Для студэнтаў дзённай формы навучання арганізуецца льготнае харчаванне са сродкаў рэктарату. Пры універсітэце працуе кафэ "Галактыка", магазін "Тамара". Студэнты цалкам забяспечаны гарачым харчаваннем па прымальных цэнах.

Для развіцця творчай асобы ў нашым універсітэце ёсць таксама ўсе ўмовы. Шматлікія самадзейныя творчыя калектывы заўсёды гатовы адчыніць дзверы талентам. Фальклорны ансамбль "Горліца", маладзёжны камерны хор "Ойра", шоу-балет "Дежа вю", тэатр эстраднай песні "Шанц" — вось назвы толькі некаторых калектываў, якія ўжо маюць папулярнасць сярод студэнтаў і выкладчыкаў БДЭУ. Гульні КВН, якія рэгулярна праводзіць студэнцкі клуб, побач з іншымі мерапрыемствамі такімі, як шоу-гульні "Любоў з першага погляду", "Пад знакам Задыяка", конкурс "Залаты Дыянісій", канцэрты, прысвечаныя знамянальным падзеям, заўсёды збіраюць поўны зал удзячных гледачоў.

Больш чвэрці века ў нашым універсітэце існуе народны вакальны мужчынскі ансамбль выкладчыкаў "Чырвоны гваздзік" і жаночы вакальны ансамбль "Элегія". Але асаблівай папулярнасцю сярод студэнтаў карыстаецца зборная каманда КВН БДЭУ "Тарыф+", якая вось ужо другі год ўдзельнічае ў рэспубліканскіх гульнях Беларускай лігі КВН. Акрамя гэтага, студэнцкі клуб прымае актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні гарадскіх, рэспубліканскіх, міжнародных конкурсаў і фестываляў. Яго творчыя калектывы вядомы не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Па праву студэнцкі клуб БДЭУ — цэнтр адпачынку, тое месца, дзе кожны студэнт, выкладчык альбо супрацоўнік ВНУ можа рэалізаваць свае ідэі, творчыя задумы, развіць свае здольнасці.

**На здымку: спартыўна-аздараўленчая база "Эканаміст" на Вілейскім вадасховішчы.**

*Фота А.Лабады.*

# Конкурс и проходной балл в БГЭУ в 1998 году

| Специальность/специализация | Форма обучения | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Дневная | | Заочная | | |
| | кон-курс | проход. балл | кон-курс | проход. балл | |
| | | | | по соб. | по экз. |
| Экономика и управление туризмом | 4,9 | 13,0 | 2,9 | — | 9,0 |
| Экономика и управление гостиничным и ресторанным хозяйством | 4,3 | 13,0 | 2,3 | 6,0 | 11,0 |
| Коммерческая деятельность и товароведение продовольственных товаров | 3,8 | 12,0 | 5,4 | 10,5 | 12,5 |
| Коммерческая деятельность и товароведение непродовольственных товаров | 4,0 | 12,0 | 5,7 | 12,5 | 12,0 |
| Коммерческая деятельность на рынке услуг | 4,2 | 12,5 | 3,3 | 11,0 | 9,0 |
| Коммерческая деятельность на рынке товаров народного потребления | 3,7 | 12,5 | 3,5 | 11,0 | 11,5 |
| Коммерческая деятельность на внешнем рынке | 3,5 | 13,0 | — | — | — |
| Учет, анализ и аудит в АПК | 3,5 | 12,5 | 2,6 | 8,0 | 10,0 |
| Учет, анализ и аудит в торговле | 4,2 | 13,0 | 6,6 | 11,0 | 11,0 |
| Учет, анализ и аудит во внешнеэкономической деятельности | 4,5 | 13,0 | — | — | — |
| Статистика | 4,3 | 13,0 | 3,3 | 10,0 | 11,5 |
| Учет, анализ и аудит в промышленности | 3,7 | 13,5 | 4,5 | 11,0 | 11,0 |
| Учет, анализ и аудит в строительстве | 4,3 | 13,0 | 3,3 | 10,0 | 11,5 |
| Учет, анализ и аудит в бюджетных и научных учреждениях | 3,8 | 13,0 | 4,0 | 10,0 | 11,0 |
| Хозяйственное право | 5,3 | 13,5 | 3,6 | 10,0 | 10,5 |
| Правовое обеспечение внешнеэкономической деятельности | 4,6 | 14,0 | — | — | — |
| Государственное и муниципальное управление | 4,5 | 13,0 | 2,7 | 9,0 | 11,0 |
| Экономика и управление на предприятиях | 4,1 | 13,0 | 4,7 | 11,0 | 12,0 |
| Экономика и управление в АПК | 3,5 | 12,0 | 1,7 | 8,0 | 10,0 |
| Экономическая кибернетика | 4,1 | 13,5 | — | — | — |
| Управление внешнеэкономической деятельностью | 3,3 | 15,0 | 2,5 | 8,0 | 10,0 |
| Маркетинг | 4,3 | 13,5 | 2,8 | 11,0 | 10,5 |
| Управление снабжением и сбытом | 4,1 | 12,5 | 2,8 | 10,5 | 12,5 |
| Кредит | 3,6 | 13,5 | 7,4 | 12,0 | 10,5 |
| Учет, анализ и аудит в банках | 4,1 | 13,0 | — | — | — |
| Финансы | 3,7 | 13,5 | 5,5 | 12,0 | 10,5 |
| Страхование | 4,0 | 12,5 | — | — | — |
| Финансы и кредит во внешнеэкономической деятельности | 4,3 | 14,0 | — | — | — |

## У БДЭУ эфектыўна і шматгранна вядзецца перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў-практыкаў (на платнай аснове) па праблемах рыначнай эканомікі і новага гаспадарчага механізма.

# Высшая школа управления и бизнеса

## *ПРЕДЛАГАЕТ подготовку и повышение квалификации специалистов по современным направлениям экономики и управления*

### 1. Подготовка специалистов на базе ВЫСШЕГО инженерно-технического или естественного образования

| Специальность | Специализация | Квалификация | Срок обучения |
|---|---|---|---|
| 1. Мировая экономика и международные экономические отношения | 1.1. Экономика и управление внешнеэкономической деятельностью | экономист | 2 г. 9 мес. |
| 2. Экономика и управление | 2.1. Экономика и управление на предприятии | экономист-менеджер | 2 г. 9 мес. |
| 3. Финансы и кредит | 3.1. Финансы | экономист | 2 г. 9 мес. |
| | 3.2. Кредит | экономист | 2 г. 9 мес. |
| 4. Бухгалтерский учет, анализ и аудит | 4.1. Промышленность, торговля, строительство | экономист | 2 г. 9 мес. |
| 5. Маркетинг | 5.1. Производственная, ВЭД | экономист | 2 г. 9 мес. |
| 6. Правоведение *) | 6.1. Хозяйственно-правовая | юрист | 2 г. 9 мес. |

*) Принимаются лица, имеющие экономическое образование и стаж не менее 2-х лет в области кредита, финансов, учета, менеджмента, маркетинга.

### 2. Подготовка специалистов на базе СРЕДНЕГО СПЕЦИАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ (Минского финансового и Пинского банковского колледжей, Молодечненского политехникума и Смиловичского заочного сельхозтехникума)

| Специальность | Специализация | Квалификация | Срок обучения |
|---|---|---|---|
| 2.1. Финансы и кредит | Финансы | экономист | 4 года |
| | Кредит | экономист | 4 года |
| 2.3. Бухгалтерский учет, анализ и аудит | Промышленность, АПК, торговля, строительство | экономист | 4 года |
| 2.4. Экономика и управление — менеджмент *) | Экономика и управление на предприятии | экономист-менеджер | 4 года |

*) Подготовка на базе технических колледжей и техникумов.

### 3. Переподготовка и повышение квалификации специалистов

| Тематика курсов | Специалисты | Срок обучения |
|---|---|---|
| 3.1. Цикл семинаров программы TACIS "Учебный Центр страхования" (выдаются специальные сертификаты и дипломы) | а) переподготовка преподавателей и руководящих специалистов страхования; б) подготовка персонала страховых компаний. | 14 курсов по 3 дня<br>20 курсов по 5 дней |
| 3.2. Цикл семинаров программы "Банковское дело" | — банков и финансовых компаний | по 5 дней |
| 3.3. Цикл семинаров программы МИД Германии "Заочное обучение рыночной экономике":<br>— рыночное мышление;<br>— управление персоналом;<br>— учет и финансовый анализ;<br>— обучающееся предпринимательство;<br>— маркетинг;<br>— стратегическое управление | — предприятий, предприниматели, безработные<br>— преподаватели экономики школ, училищ, техникумов<br>Формы занятий:<br>— семинары в университете;<br>— выездные занятия на предприятиях, фирмах;<br>— контрольно-обучающие тесты в университете | объем семинара 6—12 часов, выдаются сертификаты за цикл семинаров |
| 3.4. Курсы "Аудиторская деятельность" | — гл.(ст.) бухгалтера, финансисты, ревизоры | 126 часов: сертификат, лицензия |
| 3.5. Курсы "Автоматизация офисной работы", включая компьютеризацию и делопроизводство | — по заявкам | 40—100 часов, сертификат |
| 3.6. Семинары "Практика налогообложения" | — бухгалтера, предприниматели | 1—2 дня |
| 3.7. Специальные тематические семинары | — по заявкам | 2—3 дня |

### ОРГАНИЗУЕТ

*1. Деловые контакты с зарубежными фирмами, аудиторские и консультационные виды услуг.*

*2. Адаптацию и реализацию программных средств: деловая учебная игра "Дельта", "Биржа", бизнес-планы для инвестиций, обучающие контрольные тесты знаний по экономическим дисциплинам.*

**Для поступления на базе высшего образования представляются:** копии диплома, приложение к диплому, договор, 3 фото 3x4, ходатайство с места работы.

**Поступающие на базе среднего образования** представляют документы и проходят собеседование в установленном порядке для поступающих в ВУЗ.

Документы принимаются с 1 июня 1999 г.

Информацию об условиях приема на обучение, предоставление услуг Вы можете получить по адресу:

**220672, г. Минск, пр. Партизанский, 22 а, БГЭУ, ВШУБ.**
**Телефоны: 249-05-41, 249-70-73. Факс: 249-00-48.**
**Телефон в г. Пинске: 8-01653-03-11, 8-01653-5-38-08.**

# Бібліятэка

***Больш за мільён экзэмпляраў манаграфій, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, даведнікаў, мастацкіх выданняў, газет і часопісаў, CD ROM, аўдыа- і відэаматэр'ялаў на розных мовах налічвае фонд універсітэцкай бібліятэкі. Штогод ён павялічваецца на 40—50 тысяч асобнікаў.***

Бібліятэка імкнецца да таго, каб у ёй была ўся літаратура эканамічнага профілю, якая выдадзена на беларускай і рускай мовах і асноўныя на замежных.

Такога вялікага спецыялізаванага фонду эканамічнай літаратуры не мае, бадай, ніводная бібліятэка нашай дзяржавы. У нас шмат кніг, якія наогул адсутнічаюць у іншых бібліятэках Беларусі.

Наяўнасць у БДЭУ фундаментальнай бібліятэкі стала адным са значных фактараў, дзякуючы каторым універсітэт абвешчаны вядучай ВНУ краіны ў галіне эканамічнай адукацыі. Аддзелы бібліятэкі працуюць пры філіялах БДЭУ у Бабруйску, Пінску, Маладзечне на факультэтах і кафедрах, у студэнцкіх інтэрнатах. Рыхтуецца адкрыццё новых філіялаў.

Штодня абанементы і чытальні наведваюць амаль дзве з паловай тысячы чытачоў. Багаццем фондаў карыстаюцца не толькі студэнты, аспіранты, выкладчыкі і навукоўцы БДЭУ, але і спецыялісты навуковых устаноў, органаў кіравання, прамысловасці, АПК, прадпрымальнікі, іншыя асобы, якім спатрэбіліся сучасныя эканамічныя веды, студэнты дзяржаўных ВНУ і каледжаў, абітурыенты, што мяркуюць паступаць у БДЭУ.

У бібліятэцы універсітэта выкарыстоўваецца сучасная вылічальная тэхніка. Уся літаратура апрацоўваецца з дапамогай камп'ютэраў. Электронным каталогам бібліятэкі могуць карыстацца і абітурыенты. З дапамогай ПЭВМ штомесяц рыхтуюцца спісы і базы звестак аб новай літаратуры, падбіраецца літаратура па сучасных пытаннях эканомікі... Усё больш трапляе ў фонд выданняў на нетрадыцыйных носьбітах — CD ROM, аўдыякасетах, дыскетах.

Навукоўцы і студэнты БДЭУ могуць карыстацца міжнароднымі інфармацыйнымі рэсурсамі — весці пошук у глабальнай сетцы Internet. Не далёкі той час, калі чытачы змогуць атрымліваць неабходную інфармацыю, што ёсць у бібліятэцы, са сваіх хатніх камп'ютэраў.



У чытальні перыядычных выданняў сабраны больш пяцісот найменняў часопісаў і газет за многія гады, некаторых выданняў не мае больш ні адна бібліятэка краіны.

Фонд замежных выданняў і адпаведная чытальня дазваляюць працаваць з сучаснай эканамічнай літаратурай, часопісамі і газетамі на замежных мовах, весці моўную падрыхтоўку на самым высокім узроўні, выкарыстоўваючы арыгінальныя іншаземныя падручнікі, відэа- і аўдыяматэрыялы, камп'ютэрныя праграмы і г.д.

Усе чытачы могуць карыстацца багатым зборам мастацкай літаратуры, знаёміцца з лепшымі творамі айчынных і замежных, сусветна вядомых і сучасных пісьменнікаў: фантастыка, дэтэктыў, прыгоды, каханне... — усё што пажадае студэнцкая душа ці сэрца. Вялікую цікавасць уяўляе багатая калекцыя мастацкіх альбомаў. Мала знойдзецца нават вялікіх бібліятэк, якія могуць дазволіць сабе такі доўгі спіс літаратурна-мастацкіх, масава-папулярных, грамадска-палітычных і рэкламных часопісаў.

Абітурыенты у час падрыхтоўкі да ўступных экзаменаў таксама могуць карыстацца паслугамі бібліятэкі. Тут ёсць дастатковая колькасць падручнікаў, навучальных дапаможнікаў (напрыклад: зборнікі задач, што былі на ўступных экзаменах у мінулыя гады, дапаможнікі па замежных мовах і г.д.), даведнікаў, іншай літаратуры, разлічанай менавіта на тых, хто хоча атрымаць вышэйшую адукацыю у вядучай эканамічнай ВНУ Беларусі — Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце.

***Фота М.Лявонава.***



РЭДАКТАР А. Ц. Кучко

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі. Матэрыялы друкуюцца на мове арыгінала.

НАШ АДРАС: 220070, г. Мінск, Партызанскі пр., 26А, пакой 802, гал. кор.
Тэлефон: 248-67-91

Заснавальнік газеты — БДЭУ
Газета набрана і звярстана на рэдакцыйна-выдавецкім комплексе БДЭУ. Надрукавана афсет-ным спосабам з арыгінал-макетаў на Паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» ВПП ім. Я. Коласа. 220073, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.
Ліц. 569, фар. А-3. Зак. 1454 . Тыр. 3500.
Нумар падпісаны да друку 6.4.1999г. 14.00